Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

12 кастрычніка 2010 года, № 15-16 (2031-2032)

СУПРАЦОЎНЦТВА

ДАЛУЧЫЛІ ДАЛЯНЬ

Шэраг пагадненняў паміж Беларускім дзяржаўным і Далянскім політэхнічным універсітэтамі падпісаны 25 верасня ў Мінску рэктарамі дзвюх ВНУ акадэмікамі Сяргеем Абламейкам і Оу Цзыньпінам.

Адно з іх тычыцца стварэння сумеснага беларуска-кітайскага інавацыйнага цэнтра, беларускае аддзяленне якога будзе ў БДУ, а кітайскае – у Далянскім політэхнічным універсітэце (ДПУ). Галоўным прызначэннем цэнтра стане каардынацыя і садзейнічанне рэалізацыі сумесных інавацыйных праектаў, што ўключаюць распрацоўку і ўкараненне новай навукова-тэхнічнай прадукцыі ў эканоміку КНР і нашай краіны, а таксама міжнародны трансфер тэхналогій. Адкрыццё інавацыйнага цэнтра плануецца ў 2011 годзе.

Рэктары двух універсітэтаў падпісалі таксама пагадненне аб стварэнні сумеснай аспірантуры. Акрамя таго, быў падпісаны Пратакол аб намерах па стварэнні беларуска-кітайскага Цэнтра па садзейнічанні супрацоўніцтву паміж дзвюма краінамі ў галіне адукацыі, культуры, эканомікі і навукі.

У гэты ж дзень прайшло сумеснае пасяджэнне савета Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ, бо Далянскі політэхнічны ўніверсітэт з'яўляецца партнёрам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па ажыццяўленні дзейнасці РІК імя Канфуцыя.

Візіт кітайскай дэлегацыі ў Мінск доўжыўся да 30 кастрычніка і завяршыўся падпісаннем праграмы супрацоўніцтва паміж ДПУ і Міністэрствам адукацыі нашай краіны.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

Сяргей Абламейка і Оу Цзыньпін змацоўваюць трайное пагадненне паміж БДУ і ДПУ

Чытайце ў нумары:

ВЫНІКІ ПРАЦЫ БДУ Ў 2009–2010 НАВУЧ. Г. І ЗАДАЧЫ НА 2010–2011 НАВУЧ. Г.

З даклада рэктара акадэміка С.У. Абламейкі на пашыраным Вучоным савеце БДУ

Стар. 2–3

«ЗА 15 ГАДОЎ ЗРОБЛЕНА КАЛАСАЛЬНАЯ ПРАЦА»

Факультэт міжнародных адносін БДУ адсвяткаваў свае знакавыя ўгодкі

Стар. 6

«ТЭАТРАЛЬНЫ КУФАР»: АД ШЭКСПІРА ДА ШЭКСПІРА

У Мінску з поспехам прайшоў VII Міжнародны тэатральны фестываль, зладжаны ўпраўленнем па справах культуры БДУ

Стар. 8

ВЫСТАВЫ

Фестываль краін Садружнасці

Больш за 10 навукова-тэхнічных распрацовак БДУ прадстаўлены на першым Фестывалі навукі краін СНД, які праходзіў з 8 па 10 кастрычніка ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце.

Сярод распрацовак БДУ – камп'ютарна-арыентаваныя сродкі вымярэнняў; комплексы лабараторных установак па курсе агульнай фізікі; комплексы навучальна-даследчага абсталявання па фізіцы; вібрамеханічныя трэнажоры для рэабілітацыі; псіхафізіялагічная дыягностыка прафесійнай скіраванасці асобы; тэхналогіі ачысткі вады і інш. Акрамя таго, з навукова-папулярнай лекцыяй «Новы погляд на структуру вадкай вады і сучасныя метады яе ачысткі» выступіў загадчык лабараторыі НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ прафесар Дзмітрый Грыншпан.

У праграме: лекцыі, што трансляваліся на пляцоўках дзяржаў-удзельніц, інтэрактыўныя мерапрыемствы па навукова-папулярнай тэматыцы, прэзентацыйныя ролікі краін СНД, розныя экспазіцыі ВНУ і арганізацый. Правядзенне фестывалю скіравана на павышэнне ролі навукі ў інавацыйным развіцці краін Садружнасці, развіццё інтэлектуальнага, навуковага, творчага патэнцыялу моладзі, прыцягненне яе ў навукова-тэхнічную і інавацыйную сферу, павышэнне статусу навукоўца і выкладчыка, рэалізацыю асноўных кірункаў інавацыйнай палітыкі краін СНД, а таксама стварэнне пляцоўкі для інтэграцыі навукова-адукацыйных ініцыятыў розных дзяржаў.

Сектар выставачнай дзейнасці НДЧ–ГУН

ІНІЦЫЯТЫВЫ

ДНІ НЯМЕЦКАЙ НАВУКІ Ў БДУ

«Дні нямецкай навукі ў Беларусі» адкрыліся 5 кастрычніка ў Мінску. Арганізатарамі выступілі Федэральнае міністэрства адукацыі і даследаванняў ФРГ (BMBF) і Дзяржкамітэт па навуцы і тэхналогіях нашай краіны пры падтрымцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Першае інфармацыйнае мерапрыемства на тэму «Навуковыя даследаванні ў Германіі: партнёрства для будучыні» прайшло ў будынку рэктарата БДУ.

Прадстаўнікі нямецкіх навуковых арганізацый і тых, што ім садзейнічаюць, выступілі з аглядам сваёй дзейнасці, прадставілі механізмы і праграмы падтрымкі двухбаковага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. Адбыліся прэзентацыі паспяховых сумесных праектаў, а таксама абмеркаванне далейшых перспектыў партнёрства.

З прывітаннем да ўдзельнікаў звярнуліся: ад Федэральнага міністэрства адукацыі і даследаванняў ФРГ – Міхаэль Шліхт; ад амбасады ФРГ у Мінску – Пэтэр Дэтмар, ад БДУ – прарэктар па навуковай рабоце акадэмік Алег Івашкевіч; ад ДКНТ – старшыня Ігар Войтаў, ад Міністэрства адукацыі нашай краіны – Васіль Сафонаў; ад НАН Беларусі – вучоны сакратар прэзідыума Сяргей Чыжык і інш.

На наступны дзень, 6 кастрычніка, прымала гасцей Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. Тут прайшоў «Дзень маладых вучоных», арганізаваны Германскай службай акадэмічных абменаў (DAAD).

ФРГ і наша краіна мае працяглы досвед супрацоўніцтва ў галіне навукі, тэхналогій і інавацый. Яно грунтуецца на беларуска-германскай дамове 1993 г. «Аб развіцці шырокамаштабнага супрацоўніцтва ў галіне эканомікі, прамысловасці, навукі і тэхнікі» і ажыццяўляецца навукова-даследчымі арганізацыямі, універсітэтамі і прадпрыемствамі абедзвюх краін. Кастрычніцкія Дні нямецкай навукі ў Мінску закліканы надаць новы імпульс германска-беларускаму навукова-тэхнічнаму супрацоўніцтву.

Ларыса ПЕТРАВЕЦ

Весткі з рэктарата

РЭКТАР БДУ Сяргей Абламейка сустрэўся з паслом Турцыі Века Інал. Абмяркоўваліся магчымыя перспектывы супрацоўніцтва. У сустрэчы бралі ўдзел дэкан юрыдычнага факультэта Сяргей Балашэнка і намеснік дэкана ФМА Андрэй Русаковіч.

***

РЭКТАР Тэль-Авіўскага ўніверсітэта прафесар Арон Шай выступіў 7 кастрычніка з лекцыяй па ізраільска-кітайскіх адносінах перад студэнтамі і выкладчыкамі факультэтаў эканамічнага, гуманітарнага, філалагічнага і міжнародных адносін.

***

ДЭЛЕГАЦЫЯ БДУ на чале з першым прарэктарам Міхаілам Жураўковым брала ўдзел 18–19 верасня ў мерапрыемствах, прысвечаных 60-годдзю Харбінскага навукова-тэхнічнага ўніверсітэта, з якім БДУ мае партнёрскія пагадненні. М. Жураўкоў правёў перамовы аб развіцці супрацоўніцтва, а таксама выступіў на міжнародным форуме «Выклікі і магчымасці ў глабальнай вышэйшай адукацыі».

***

ПРАРЭКТАР БДУ па навуковай рабоце Алег Івашкевіч сустрэўся 21 верасня з намеснікам начальніка ўпраўлення навукі і тэхнікі Народнага ўрада г. Харбін Кун Сянь І для абмеркавання прынцыпаў функцыянавання беларуска-кітайскага інавацыйнага цэнтра, заснаванага сумесна з БДУ. Дарэчы, дзейнасць цэнтра падтрымліваецца ўрадам не толькі горада, але і самой правінцыі Хэйлуцзян, які разглядае яго як каардынатара ўсяго беларуска-кітайскага супрацоўніцтва ў рэгіёне. Таксама ўзгоднены візіт у лістападзе прадстаўнічай дэлегацыі Харбіна ў Мінск для падпісання новых буйных кантрактаў.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

Вынікі работы БДУ ў 2009–2010 навуч. г.

З даклада рэктара БДУ акадэміка С. У. Абламейкі на пашыраным пасяджэнні Вучонага савета 20 верасня 2010 г.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт – гэта вучэбна-навукова-вытворчы комплекс, дзейнасць якога заснавана на Місіі і Палітыцы, зацверджаных Вучоным саветам універсітэта ў красавіку 2009 г. Акрамя асноўных задач па падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, магістраў і навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі, у комплексе ў вялікіх аб'ёмах ажыццяўляецца навукова-даследчая, навукова-інавацыйная, вытворчая дзейнасць.

На сённяшнім пасяджэнні Вучонага савета будуць разгледжаны пераважна вынікі адукацыйнай дзейнасці за 2009–2010 навуч. г., бо навуковая, вытворчая і фінансава-гаспадарчая дзейнасць разглядаюцца ў поўным аб'ёме па заканчэнні каляндарнага года.

Адукацыйная дзейнасць па праграмах даўніверсітэцкай падрыхтоўкі вядзецца ў Ліцэі БДУ, на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі, на створаных у шэрагу структурных падраздзяленняў падрыхтоўчых курсах. Юрыдычны каледж вядзе падрыхтоўку правазнаўцаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй з правам працягу навучання на юрыдычным факультэце на конкурснай аснове; 15 факультэтаў і 4 інстытуты рыхтуюць спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, магістраў, а таксама ажыццяўляюць пасляўніверсітэцкую адукацыю ў аспірантуры і дактарантуры. Перападрыхтоўка спецыялістаў па праграмах вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца ў 6 інстытутах, 5 з якіх маюць статус юрыдычнай асобы.

ДАЎНІВЕРСІТЭЦКАЯ АДУКАЦЫЯ

Усяго ў 10–11 класах Ліцэя БДУ навучаецца каля 490 чалавек. Гэта навучальная ўстанова вядомая ў краіне вялікімі дасягненнямі навучэнцаў у рэспубліканскіх і міжнародных прадметных алімпіядах, высокай доляй паступлення выпускнікоў у ВНУ і характарызуецца вялікімі конкурсамі сярод тых, хто паступае на ўсе профілі навучання.

У юрыдычным каледжы БДУ зараз навучаецца 676 чалавек, што на 100 чалавек больш, чым у 2005–2006 навуч. г. Сярод кантынгенту навучэнцаў з'явіліся замежныя грамадзяне, што сведчыць пра рост папулярнасці каледжа. Станоўчую дынаміку дэманструе і даўніверсітэцкая падрыхтоўка – прырост слухачоў у параўнанні з 2005–2006 навуч. г. склаў 400 чалавек. Гэта пацвярджае правільнасць прынятага рашэння аб аднаўленні дзейнасці факультэта даўніверсітэцкай адукацыі ў структуры ўніверсітэта.

ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ

У цэлым у 2010 г. прынята на першы курс 6218 студэнтаў, што на 100 чалавек больш, чым у 2009 г. 130 пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд залічаны без уступных выпрабаванняў, сярод залічаных на дзённую форму 19% медалістаў. Аднак трэба адзначыць, што ў арганізацыі прыёму студэнтаў на першы курс у 2010 г. на шэрагу спецыяльнасцяў былі складанасці з забеспячэннем конкурсу, якія, магчыма, былі абумоўлены пэўным дэмаграфічным спадам. Колькасць выпускнікоў школ прыкладна на 8 тысяч меншая, чым летась. На 5–6 тыс. чакаецца зніжэнне колькасці выпускнікоў і ў наступным годзе, што запатрабуе ад нас больш напружанай працы для прыцягнення на ўсе спецыяльнасці і формы навучання найбольш падрыхтаваных абітурыентаў і выканання плана прыёму. У 2010 г. на спецыяльнасць «беларуская філалогія» з-за адсутнасці конкурсу на 50 бюджэтных месцаў залічана 42 студэнты, на платную форму адсутнічаў конкурс на фізічным, механіка-матэматычным, хімічным факультэтах, факультэце радыёфізікі і электронікі. Мы абмяркоўвалі гэтую сітуацыю на нарадзе з дэканамі і прыйшлі да высновы аб неабходнасці, акрамя ўзмацнення прафарыентацыйнай працы, мадэрнізацыі дзейнасці факультэтаў – адкрыцця падрыхтоўкі па новых найбольш запатрабаваных спецыяльнасцях, стварэння новых кафедраў з улікам сусветнага досведу развіцця ўніверсітэцкай адукацыі. Трэба перабудоўвацца і ісці ў нагу з часам. Кансерватызм у пэўнай ступені – гэта добра, але нельга стаяць на месцы. Ёсць спецыяльнасці і кафедры, якія існуюць 40 і больш гадоў, і іх трэба прыводзіць у адпаведнасць новым абставінам.

Падрыхтоўка кадраў на першай ступені вышэйшай адукацыі вядзецца па 55 спецыяльнасцях, на другой (магістратура) – па 47; у аспірантуры – па 113; у дактарантуры – па 29. У 2010 г. адкрыта падрыхтоўка студэнтаў на першай ступені вышэйшай адукацыі па дзвюх новых спецыяльнасцях: «аэракасмічныя радыёэлектронныя і інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі» і «прыкладная інфарматыка», па 6 спецыяльнасцях адкрыты новыя напрамкі падрыхтоўкі.



КОЛЬКАСЦЬ НАВУЧЭНЦАЎ БДУ

Колькасць навучэнцаў на ўсіх формах і ўзроўнях навучання, уключаючы перападрыхтоўку, складае 34,2 тыс. чалавек, што на 350 чал. перавысіла паказчык папярэдняга навучальнага года. Гэта добрая тэндэнцыя, хоць і спалучаная з некаторым ростам вучэбнай нагрузкі выкладчыкаў і праблемамі з забеспячэннем навучальнымі плошчамі. Тым не менш цяпер у нас на дзённай форме навучаецца 20 206 студэнтаў (на 408 больш, чым у 2009–2010 навуч. г.) і на завочнай – 8 758 (на 440 больш, чым у 2009–2010 навуч. г.). Усяго з улікам замежнікаў на платнай форме навучаецца 61% студэнтаў, сярод беларускіх студэнтаў – 57% «платнікаў». Заўважу, што гэтая прапорцыя ўтварылася за кошт росту колькасці студэнтаў платнай формы навучання пры невялікім росце прыёму на бюджэтную форму. Станоўчая тэндэнцыя павелічэння кантынгенту захоўваецца таксама на завочнай форме навучання, таму асобнага разгляду патрабуе пытанне аб пашырэнні пераліку спецыяльнасцяў, па якіх можна рыхтаваць кадры без адрыву ад вытворчасці.



АДЛІЧЭННІ СТУДЭНТАЎ

Нас не могуць не турбаваць пытанні адсеву студэнтаў. У справаздачным годзе было адлічана 750 студэнтаў дзённай формы навучання, з іх 373 па ўласным жаданні; 663 – завочнай, з іх 190 па ўласным жаданні; 60 магістрантаў, з іх 27 – па ўласным жаданні. Найбольшая колькасць адлічэнняў на гуманітарным і гістарычным факультэтах, ФМА. 33% ад агульнай колькасці студэнтаў, якія выбылі, на дзённай форме адлічаны за акадэмічную непаспяховасць, на завочнай – 43%. Адлічэнні не павінны насіць масавы характар, тут неабходны індывідуальны падыход. Асабліва ўважліва неабходна падыходзіць да адлічэння першакурснікаў. У гэтым годзе мы залічылі на шэраг спецыяльнасцяў абітурыентаў, якія паказалі на цэнтралізаваным тэсціраванні невысокія вынікі. Такіх студэнтаў неабходна ўзяць пад асаблівы кантроль аж да правядзення дадатковых заняткаў і аказання псіхалагічнай дапамогі. Калі мы не зробім гэтага ў пачатку семестра, то чакаць добрых вынікаў у першую экзаменацыйную сесію не прыйдзецца.

ПАСПЯХОВАСЦЬ СТУДЭНТАЎ

Прыходзіцца канстатаваць паступовае зніжэнне абсалютнай паспяховасці студэнтаў. Прычым на прыродазнаўчых спецыяльнасцях яна троху вышэйшая, чым на гуманітарных. На гуманітарных факультэтах найбольш нізкія паказчыкі паспяховасці на эканамічным, гуманітарным, юрыдычным факультэтах, на прыродазнаўчых – на фізічным і ФПМІ. Адно з тлумачэнняў зніжэння паспяховасці – павышэнне патрабавальнасці выкладчыкаў да якасці ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў, другое – рост ліку студэнтаў платнай формы, якія паступілі ў БДУ з недастатковай базавай падрыхтоўкай. У другім аспекце нам не варта быць пасіўнымі назіральнікамі таго, што адбываецца, тым больш што, укараніўшы сістэму менеджменту якасці, мы не маем права зніжаць узровень падрыхтоўкі выпускнікоў. Колькасць студэнтаў, якія навучаюцца на «выдатна», таксама зніжаецца – з 20% дзесяць гадоў таму назад да 10% цяпер. Часткова гэта звязана з пераходам на 10-бальную сістэму, па якой выкладчыкі не вельмі ахвотна ставяць 9 або 10 балаў. Відавочна, вучэбна-метадычным камісіям факультэтаў і кафедраў неабходна з улікам назапашанага досведу вярнуцца да пытання пра крытэрыі ацэньвання і выстаўлення адзнак на іспытах.

Некалькі слоў пра магістратуру. Цікавасць да яе расце, у тым ліку ў замежных грамадзян, павялічваецца колькасць ахвотных навучацца за аплату. Разам з тым у сувязі з інавацыйнай скіраванасцю нашай эканомікі, наспела неабходнасць стварэння практыка-арыентаванай магістратуры, уключаючы навучанне на замежных мовах. Магчыма, гэта дазволіць пазбегнуць вялікіх адсеваў магістрантаў, пра што гаварылася вышэй.



ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ І ПЕРАПАДРЫХТОЎКА

Развіццё такога роду адукацыйных паслуг, як павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка, становіцца ўсё больш актуальным. Гэта вельмі перспектыўны сегмент у дзейнасці любога сучаснага ўніверсітэта. У нас ужо ёсць шэраг інстытутаў, якія гэтым паспяхова займаюцца, але неабходна, каб усе факультэты падключыліся да гэтай працы. У 2009–2010 навуч. г. ужо каля 3 тыс. чалавек прайшлі перападрыхтоўку праз нашы інстытуты, але далёка не ўсе рэзервы яшчэ выкарыстоўваюцца. Трэба разнастаіць і паляпшаць якасць праграм павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, рабіць іх больш прывабнымі для спажыўцоў адукацыйных паслуг. Галоўнаму ўпраўленню вучэбнай і навукова-метадычнай работы пастаўлена задача распрацоўкі механізму ўзаемадзеяння факультэтаў з падраздзяленнямі, якія вядуць павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку.

АПЫТАННЕ

Выбарачны аналіз задаволенасці вучобай выпускнікоў БДУ паказвае, што маладыя спецыялісты ў цэлым задаволеныя ўзроўнем тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці, навыкамі навукова-даследчай і самастойнай працы. У той жа час на многіх факультэтах студэнты нізка ацэньваюць свае веды замежных моў (за выключэннем юрыдычнага, эканамічнага, гуманітарнага факультэтаў і ФПМІ), а таксама навыкі кіраўніцкай дзейнасці. Мы сапраўды даём студэнтам недастатковую падрыхтоўку ў галіне менеджменту, у тым ліку ў перыяд праходжання вытворчай практыкі. Таму навукова-метадычнаму савету ўніверсітэта трэба падумаць, якім чынам уключыць у адукацыйныя праграмы асновы менеджменту або ўвесці адпаведныя факультатывы. У плане практычнай падрыхтоўкі кіраўніцтву факультэтаў неабходна перагледзець пералік баз вытворчай практыкі, максімальна наблізіўшы іх да месцаў будучай працы. Выкарыстанне факультэтамі прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, радыёфізікі і электронікі ў якасці баз практыкі пераважна сваіх кафедраў нельга прызнаць абгрунтаваным.

АСПІРАНТУРА І ДАКТАРАНТУРА

Летась, дзякуючы прынятым захадам, мы ўпершыню за апошнія тры гады выканалі план прыёму ў аспірантуру. Спадзяёмся на выкананне яго і сёлета. Апошнія пяць гадоў колькасць аспірантаў у БДУ зніжалася. І гэта прытым, што многія інавацыйна-арыентаваныя ўніверсітэты свету імкліва нарошчваюць аб'ёмы падрыхтоўкі аспірантаў. У наступным годзе нам неабходна ўтрымаць іх колькасць на ўзроўні 630–650 чалавек, не зніжаючы прыём замежных грамадзян і нашых суайчыннікаў, якія навучаюцца на платнай аснове, якіх у справаздачным годзе было каля 140 чал.

У дактарантуры БДУ навучаецца 10 чалавек. У апошнія гады колькасць дактарантаў зменшылася. І тут таксама варта прааналізаваць сітуацыю і распачаць адпаведныя захады. Трэба запрашаць у дактарантуру маладых дацэнтаў і старшых выкладчыкаў, прадумаўшы і захады матэрыяльнага стымулявання. У 2010 г. выпускнікі дактарантуры мінулага года паспяхова абаранілі 2 дысертацыі.

У апошнія гады ў нас абараняецца каля 60 кандыдацкіх дысертацый і 4–7 доктарскіх. І нельга зніжаць гэтых тэмпаў. Я заклікаю ўсіх кіраўнікоў надаваць больш увагі гэтаму пытанню: аказваць усялякую падтрымку маладым навукоўцам, у тым ліку і ў публікацыі па-за чаргой вынікаў дысертацыйных даследаванняў. Адносная колькасць абароненых у тэрмін кандыдацкіх дысертацый у апошнія гады складае каля 12%, што з'яўляецца добрым паказчыкам, але толькі ў параўнанні з аспірантурамі іншых арганізацый.

Колькасць аспірантаў па комплексе БДУ

Год	2005	2006	2007	2008	2009	2010
Усяго аспірантаў з ліку грамадзян РБ, у т.л. вочнай формы навучання	818	738	640	578	663	621
	479	439	409	371	413	391
Аспірантаў з ліку грамадзян РБ платнай формы навучання	6	17	37	52	75	64
Замежных аспірантаў	24	37	65	83	84	74

Заўвага: 2010 г. на 31.08.2010г., 2005-2010 гг. на 31.12

КАДРАВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ БДУ

Усяго ў комплексе БДУ працуе 8 388 чалавек. 90% з іх – асноўныя работнікі, і 10% – знешнія сумяшчальнікі.

Штатных работнікаў ПВС у комплексе – 2 455 і сумяшчальнікаў – 575. Кандыдатаў навук ад ліку штатных работнікаў 46% і дактароў навук – 9%. Для пацвярджэння статусу вядучай ВНУ трэба, каб больш за палову выкладчыкаў мелі вучоныя ступені або званні. Адзначу, што 128 дактароў навук і 259 кандыдатаў навук толькі на факультэтах БДУ старэйшыя за 60 гадоў. Работнікі пенсійнага ўзросту сярод ПВС складаюць звыш 30%. Сярод работнікаў ПВС ва ўзросце да 29 гадоў вучоныя ступені маюць усяго 16%. Сярэдні ўзрост загадчыкаў кафедраў – 53 гады. З іх 65 гадоў і старэйшыя – 12%, а да 40 гадоў – 5%. Гэтую сітуацыю трэба мяняць. Яшчэ раз падкрэсліваю, што пытанне абарон дысертацый маладымі супрацоўнікамі вельмі важнае, і на гэта павінны быць накіраваны ўсе нашы намаганні. Прыцягненне ж сумяшчальнікаў без вучоных ступеняў і званняў на выкладчыцкую працу павінна адбывацца толькі ў выключных выпадках.

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

і задачы на 2010–2011 навуч. г.



НАВУКОВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Пры агульным росце аб'ёму фінансавання навуковых даследаванняў (на 1 жніўня 2010 г. разам з гасдамоўнымі працамі 57,7 млрд руб.). Колькасць навуковых тэм памяншаецца за кошт выключэння і аб'яднання дробных, што нядрэнна. У 2009 г. пададзена каля 250 заявак на аб'екты прамысловай уласнасці, што амаль на 50 адзінак перавысіла ўзровень 2008 г. Экспарт навукова-тэхнічнай прадукцыі дасягнуў аб'ёму ў 1,8 млн дол. ЗША. У гэтай складанай галіне нашымі супрацоўнікамі прыкладаецца нямала намаганняў, але ў цэлым патэнцыял БДУ павінен выкарыстоўвацца больш інтэнсіўна і эфектыўна.

НАВУКОВАЯ РАБОТА СТУДЭНТАЎ

Колькасць студэнтаў, якія ўдзельнічаюць у НДРС, расце. І гэта мы павінны ўсяляк заахвочваць. У БДУ праводзіцца штогадовая канферэнцыя для маладых навукоўцаў і студэнтаў з публікацыяй дакладаў. У справаздачным годзе прайшла 67-я канферэнцыя, на якой студэнты зрабілі 3 957 дакладаў. Акрамя таго, студэнты прачыталі 443 даклады на рэспубліканскіх канферэнцыях, 899 – на міжнародных. У 2009 г. у суаўтарстве са студэнтамі апублікаваны 2 054 навуковыя работы, у 2008 г. – 1 827. Вырасла колькасць СНДЛ, цяпер іх 29. Штогод больш за 70 студэнтаў ўзнагароджваюцца стыпендыямі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы таленавітай моладзі.



МІЖНАРОДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Штогод БДУ заключае каля 40–45 дамоў аб супрацоўніцтве ў асноўным з універсітэтамі Заходняй і Цэнтральнай Еўропы, краін СНД і ўсходняй Азіі. Цяпер нашы намаганні скіраваны на тое, каб зрабіць БДУ актыўным удзельнікам міжнароднага рынку адукацыйных паслуг, для чаго важна падняць статус універсітэта ў розных міжнародных рэйтынгах. Так, у даволі вядомым рэйтынгу Вебаметрыкс, у якім ацэньваецца дзейнасць універсітэтаў па прысутнасці ў інтэрнэце, у справаздачным годзе мы істотна прасунуліся наперад. Зараз мы знаходзімся на 1300 месцы, чаму спрыяла размяшчэнне на сайце БДУ навуковых публікацый і стварэнне персанальных старонак навукова-педагагічных работнікаў.

АБ'ЁМ ЭКСПАРТУ АДУКАЦЫЙНЫХ ПАСЛУГ

Дзякуючы прынятым захадам нам удалося ў 2009 г. падняць аб'ём экспарту адукацыйных паслуг да 3,7 млн дол. ЗША пры 1,9 млн дол. ЗША ў 2008 г. У гэтым годзе плануем дасягнуць не меншых вынікаў. Усяго летась у нас навучалася 1 716 замежнікаў. Далейшае нарошчванне колькасці замежных навучэнцаў ускладняецца абмежаванасцю навучальных рэсурсаў і дэфіцытам месцаў у інтэрнатах. Большасць замежных студэнтаў прыязджае да нас з Азіі – 53%, 33% – з краін СНД.

Найбольшая колькасць замежнікаў, прыкладна па 250 чалавек, навучаецца на трох факультэтах – філалагічным, эканамічным і ФМА. Разумеючы, што навучанне замежных грамадзян – важны паказчык у міжнародным рэйтынгу ўніверсітэта, неабходна адшукваць шляхі пашырэння гэтага віду адукацыйных паслуг.

Міжнародную дзейнасць БДУ характарызуе і колькасць замежных камандзіровак. Толькі за 8 месяцаў гэтага года 440 студэнтаў і 615 супрацоўнікаў удзельнічала ў канферэнцыях, семінарах і спартыўных мерапрыемствах за мяжой. Павелічэнне колькасці камандзіраваных магчымае ў тым выпадку, калі частку выдаткаў возьме на сябе бок, які прымае.



МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЯ БАЗА

Балансавы кошт навучальнага і навуковага абсталявання расце і зараз складае 78,5 млрд руб. У 2009 г. закупілі навуковага абсталявання на 1,9 млрд руб. У 2010 г. Міністэрства адукацыі выдзеліла вялікія сумы на закупкі абсталявання па дзяржаўных праграмах, набываем мы яго таксама і з пазабюджэтных крыніц. Тым не менш ва ўніверсітэце застаецца яшчэ значная частка састарэлага вымяральнага абсталявання, якая патрабуе аператыўнага абнаўлення.

АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ІНФАРМАТЫЗАЦЫІ НАВУЧАЛЬНАГА ПРАЦЭСУ І НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

У 2003 г. была пачата шырокамаштабная работа па стварэнні электронных адукацыйных рэсурсаў, масавым уключэнні выкладчыцкага складу ў працэс інфармацыйнага забеспячэння самастойнай працы студэнтаў. Зараз у сістэме e-University размешчаны матэрыялы больш чым па 1400 вучэбных курсах, загадам рэктара БДУ ад 16.03.2010 г. створана электронная бібліятэка БДУ *http://www.elib.bsu.by*.

Галоўная задача сёння – распрацоўка электронных вучэбна-метадычных комплексаў (ВМК) па ўсіх асноўных дысцыплінах. Гэта задача няпростая, але я заклікаю дэканаў усімі спосабамі дамагацца таго, каб кожны навучальны курс суправаджаўся ВМК. Кожны выкладчык у гэтым семестры павінен яго падрыхтаваць, хоць бы па спрошчанай форме. А далей па ўсіх неабходных патрабаваннях: з канспектам лекцый, практычнымі і лабараторнымі заняткамі, пытаннямі, заданнямі і г.д. У папярэднім пяцігоддзі ў гэтым дачыненні зроблена вялікая праца, і мы павінны яе працягваць.

Фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў

Новая версія сайта БДУ атрымала першую прэмію на міжнароднай выставе TIBO–2010 у намінацыі «Адукацыя і навука». Гэта адзіны сярод сайтаў беларускіх ВНУ, які палепшыў за апошні год міжнародны рэйтынг больш чым на 400 пазіцый. За апошні год па папулярнасці ў беларускай аўдыторыі (сярод усіх сайтаў свету) ён перамясціўся з 459 на 211 месца.

Перад БДУ стаіць задача стварэння кластара нацыянальнай і міжнароднай сетак размеркаваных вылічэнняў – ГРІД-сетак для таго, каб мы маглі мець доступ і да іншых беларускіх і міжнародных рэсурсаў. Праектаў тут вельмі шмат, асабліва гэта датычыцца прыродазнаўчых факультэтаў. Наяўнасць такіх магчымасцяў разам з суперкамп'ютарам павышае шанцы на атрыманне міжнародных грантаў.

СІСТЭМА МЕНЕДЖМЕНТУ ЯКАСЦІ Ў БДУ

Укараненне сістэмы менеджменту якасці ў БДУ пачалося з лістапада 2008 г. у адпаведнасці з загадам Міністэрства адукацыі. Была праведзена вялікая праца, у выніку якой у ліпені 2010 г. мы атрымалі сертыфікаты на адпаведнасць сістэмы менеджменту якасці патрабаванням міжнароднага стандарту ISO 9001 у нацыянальнай сістэме сертыфікацыі і ў нямецкай сістэме сертыфікацыі TGA. Але на гэтым працэс укаранення СМЯ не заканчваецца. На парадку дня маніторынг дасягненняў мэтаў у галіне якасці, распрацаваных на 2010 г. Сярод іх удзел у міжнародных рэйтынгах, павелічэнне колькасці супрацоўнікаў з вучонай ступенню, падрыхтоўка спецыялістаў па новых спецыяльнасцях, стварэнне новых адукацыйных праграм, забеспячэнне росту колькасці студэнтаў, павелічэнне аб'ёму фінансавання НДВКР і экспарту адукацыйных паслуг, выкананне плана прыёму ў аспірантуру і іншыя. Канкрэтныя параметры мэтавых паказчыкаў мы з вамі ўжо абмяркоўвалі.

ФІНАНСЫ

У 2008 г. даходы комплексу БДУ склалі 285 млрд руб., у 2009 г. – 329 млрд руб., план у 2010 г. – 351 млрд руб. У структуры даходаў комплексу БДУ ў 2009 г. 55,4% займаў бюджэт і 44,6% – пазабюджэт, план на 2010 г. – 58,4% бюджэт, 41,6% – пазабюджэт. У структуры планавых даходаў на 2010 г. 59,4% складаюць адукацыйныя паслугі, 14,6% – навуковая дзейнасць, 26,0% – вытворчая дзейнасць.



СЯРЭДНЯМЕСЯЧНАЯ ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА

Сярэдняя заработная плата ПВС за першае паўгоддзе склала 1 807 тыс. руб., работнікаў комплексу БДУ – 1 282 тыс. руб., работнікаў БДУ – 1 263 тыс. руб. У цэлым паказчыкі нядрэнныя, хоць для дасягнення паказчыкаў па росце сярэдняй заработнай платы па ўсім універсітэцкім комплексе, даведзеных Міністэрствам адукацыі, мы будзем адшукваць рэзервы і спадзяёмся, што да канца года яны будуць дасягнуты.



Звесткі аб сяреднямесячнай заработнай плаце ў БДУ

Паказчыкі	2005 г	2006 г	2007 г	2008 г	2009 г	1 п/г 2010 г.
Адукацыя РБ	398,4	488,3	544,1	629,5	696,9	766,7
Комплекс БДУ	611,3	741	846,5	1187,3	1224,5	1282
Работнікі БДУ	641	749,7	826,8	1156,3	1232,7	1263,4
ПВС БДУ	846,4	985,3	1077	1586,5	1708,2	1806,7

Ідэалагічная і выхаваўчая праца ў 2009–2010 навуч. г. праводзілася ў адпаведнасці з зацверджаным планам і была скіравана на фарміраванне ў студэнтаў адказнай грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму, добрасумленнага стаўлення да вучобы. Задачы па яе ўдасканаленні стануць прадметам асобнага разгляду на пасяджэнні Вучонага савета.

РАШЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА БДУ

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад рэктара акадэміка НАН Беларусі С.У. Абламейкі «Вынікі працы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 2009–2010 навуч. г. і задачы на 2010–2011 навуч. г.», Вучоны савет адзначае, што калектыў універсітэта ў мінулым навучальным годзе накіроўваў свае высілкі на рэалізацыю мерапрыемстваў Праграм развіцця ўніверсітэта (2005–2011 гг.), Плана перспектыўнага развіцця на 2006–2010 гг., укараненне сістэмы менеджменту якасці (СМЯ). У 2009–2010 навуч. г. былі ўдакладнены Місія і Палітыка ў галіне якасці, дапрацаваны і зацверджаны стандарты ўніверсітэта, вызначаны мэтавыя паказчыкі ў галіне якасці, праведзены прамежкавыя маніторынгі працэсаў і аналіз выканання мэт, унутраны і сертыфікацыйны аўдыты. У чэрвені 2010 г. БДУ атрымаў сертыфікаты сістэмы менеджменту якасці на адпаведнасць патрабаванням міжнароднага стандарту ISO 9001 у нацыянальнай сістэме сертыфікацыі і ў нямецкай сістэме сертыфікацыі TGA. У 2009 г. была прынята Праграма ўзаемадзеяння камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама і БДУ па навукова-метадычным забеспячэнні, узмацненні навуковага складніка павышэння кваліфікацыі кіраўнічых супрацоўнікаў і спецыялістаў адукацыі, арганізацыі падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі педагагічных кадраў на 2009–2010 гг.

У комплексе БДУ разам са знешнімі сумяшчальнікамі працуюць 14 акадэмікаў і 16 членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі. Сярод штатных выкладчыкаў комплексу БДУ 9% з'яўляюцца дактарамі і 46% кандыдатамі навук. Аднак па-ранейшаму застаецца нізкай укамплектаванасць некаторых агульнаўніверсітэцкіх кафедраў і кафедраў замежных моў выкладчыкамі, якія маюць вучоныя ступені і званні. Захоўваецца тэндэнцыя старэння кадраў. На канец 2009–2010 навуч. г. ва ўніверсітэце без уліку юрыдычных асоб працавалі 705 (32%) штатных выкладчыкаў пенсійнага ўзросту.

Падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй вядзецца па 55 спецыяльнасцях на першай ступені, па 47 – на другой. У 2010–2011 навуч. г. адкрыты 2 новыя спецыяльнасці: «прыкладная інфарматыка», «аэракасмічныя радыёэлектронныя і інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі» і 2 новыя кірункі спецыяльнасцяў – «прыкладная механіка», «менеджмент СМІ». Упершыню ажыццёўлены набор для атрымання другой вышэйшай адукацыі са скарочаным тэрмінам навучання па спецыяльнасцях: «псіхалогія», «правазнаўства (кірунак «прававое забеспячэнне бізнесу», «менеджмент (кірункі: «менеджмент нерухомасці», «фінансавы і інвестыцыйны менеджмент», «сацыяльны і адміністрацыйны менеджмент».

Па комплексе БДУ на 1 верасня 2010 г. па праграмах даўніверсітэцкай падрыхтоўкі, сярэдняй і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, вышэйшай і пасляўніверсітэцкай адукацыі, перападрыхтоўкі навучаюцца 34 306 чал. У 2010–2011 навуч. г. да заняткаў прыступілі 28 964 студэнты. На дзённай форме навучаецца 20 206 студэнтаў, з іх 10 966 (54%) на платнай аснове, на завочнай – 8 758 студэнтаў, з іх 6 637 (76%) на платнай аснове.

У магістратуру па комплексе БДУ ў 2009–2010 навуч. г. быў залічаны 621 чал., з іх 391 (63%) на платнай аснове. У той жа час за навучальны год толькі з магістратуры БДУ адлічана па розных прычынах 60 студэнтаў (12,4%).

У 2009–2010 навуч. г. на дзённай форме навучання абсалютная паспяховасць у зімовую сесію на гуманітарных факультэтах склала 80,2%, на прыродазнаўчых – 81,9%; у вясеннюю – адпаведна 80,2% і 83,4%. Доля студэнтаў, якія вучацца на «выдатна», па выніках вясенняй сесіі склала на прыродазнаўчых факультэтах 3,7%, на гуманітарных – 6,8%, што прыкладна на 2% ніжэй за паказчыкі папярэдняга навучальнага года.

За 2009–2010 навуч. г. з дзённай формы навучання па розных прычынах адлічана 750 студэнтаў (4%), з завочнай – 663 (8%). 373 студэнты дзённай формы (50% ад ліку адлічаных) былі адлічаны за акадэмічную непаспяховасць, 245 (33%) – па ўласным жаданні, з завочнай формы навучання адпаведна 190 (29%) – па ўласным жаданні і 282 (43%) – за акадэмічную непаспяховасць.

Захоўваецца тэндэнцыя паніжэння абсалютнай паспяховасці і колькасці тых, хто вучыцца на «выдатна», вялікага адсеву студэнтаў, што патрабуе распрацоўкі комплексу адмысловых мерапрыемстваў і прыняцця пэўных захадаў па арганізацыі працы навучальнага і выхаваўчага характару з тымі студэнтамі, якія адстаюць.

У 2010 г. 93% выпускнікоў універсітэта, якія навучаліся за кошт сродкаў бюджэту, размеркаваны на працу, 1% не працаўладкаваны з прычыны адсутнасці месцаў. Аднак па-ранейшаму вялікая колькасць выпускнікоў хадайнічаюць у наступным аб перазмеркаванні, што сведчыць пра дрэнную інфармаванасць студэнтаў наконт характару іх будучай вытворчай дзейнасці.

Працягвае ўмацоўвацца матэрыяльна-тэхнічная база інфарматызацыі. У студзені 2010 г. уведзены ў эксплуатацыю суперкамп'ютар «СКІФ», перададзены БДУ бязвыплатна АІПІ НАН Беларусі. Вылічальная магутнасць яго складае 2,5 трыльёна аперацый з плавальнай кропкай у секунду. Рэсурсы суперкамп'ютарнага цэнтра актыўна выкарыстоўваюцца фізічным, хімічным, механіка-матэматычным факультэтамі, факультэтам прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. У 2010 г. набыта 200 новых персанальных камп'ютараў, пашыраны канал доступу БДУ ў інтэрнэт да 54 Мбіт/с, а з кастрычніка 2010 г. пашыраецца да 200 Мбіт/с без павелічэння аплаты. Гэта стала магчымым дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву ЦІТ БДУ і АІПІ НАН Беларусі. У 2010 г. міжнародны рэйтынг інтэрнэт-сайта БДУ ўзрос амаль на 500 пунктаў. На міжнароднай выставе-кангрэсе Tibo–2010 сайт БДУ быў удастоены першага месца ў намінацыі «Навука і адукацыя». Тэхналагічныя і метадычныя аспекты стварэння сучасных электронных ВМК былі адпрацаваны ў 2008–2010 гг. у ЦІТ, на ФПМІ, кафедрах псіхалогіі і педагогікі ў працэсе распрацоўкі ЭВМК па заданнях Міністэрства адукацыі па дысцыплінах: «Праграмаванне», «Вышэйшая матэматыка», «Лікавыя метады», «Тэорыя верагоднасцяў і матэматычная статыстыка», «Псіхалогія», «Педагогіка». У рамках выканання праграмы «Удасканаленне арганізацыі, забеспячэння і кантролю якасці самастойнай працы студэнтаў» актывізавалася праца па падрыхтоўцы і выданні вучэбна-метадычных комплексаў, аўтарскіх падручнікаў, навучальных дапаможнікаў, курсаў лекцый па дысцыплінах навучальных планаў. Аднак праца яшчэ далёкая ад завяршэння, забяспечанасць у цэлым навучальнай літаратурай на гуманітарным факультэце не перавышае 30%, на эканамічным – 50%. На хімічным і фізічным факультэтах, у Інстытуце журналістыкі гэты паказчык складае звыш 90%. Па-ранейшаму востра стаіць пытанне падрыхтоўкі вучэбна-метадычных комплексаў, падручнікаў і навучальных дапаможнікаў з грыфам Міністэрства адукацыі і навучальна-метадычных дапамож-нікаў з грыфам ВМА. Неабходна актывізаваць працу па забеспячэнні адукацыйнага працэсу навучальна-метадычнымі комплексамі і аўтарскімі курсамі лекцый, распрацоўцы новай праграмы, накіраванай на поўнае забеспячэнне дысцыплін навучальнага плана, якія выкладаюцца, літаратурай, у тым ліку на электронных носьбітах.

На шэрагу факультэтаў (ФПМІ, біялагічны, радыёфізікі і электронікі) практычна не выкарыстоўваюцца або слаба выкарыстоўваюцца ў якасці баз вытворчай практыкі прамысловыя прадпрыемствы рэспублікі. У той жа час гэты паказчык на механіка-матэматычным факультэце складае 35% ад ліку практыкантаў, на фізічным – 29%, эканамічным – 28%, міжнародных адносін – 22%.

На 31.08.2010 г. у комплексе БДУ навучаўся 621 аспірант (у папярэднім годзе на канец каляндарнага года – 663), на платнай форме навучання грамадзян Рэспублікі Беларусь – 64 (у папярэднім годзе – 75), замежных аспірантаў – 74 (у папярэднім годзе – 84), 10 дактарантаў (у папярэднім годзе – 12).

У 2009 г. у БДУ выканана 1211 тэм НДР з аб'ёмам фінансавання 48 363 млн руб. і 330 гасдамоўных НДР з аб'ёмам фінансавання 8 559 млн руб. У 2008 г. аб'ёмы фінансавання складалі адпаведна 39 076 млн руб. і 5 100,7 млн руб.

БДУ з'яўляецца галаўным выканаўцам 8 дзяржаўных комплексных праграм навуковых даследаванняў, 3 дзяржаўных праграм фундаментальных навуковых даследаванняў, 4 дзяржаўных праграм арыентаваных фундаментальных навуковых даследаванняў, 1 дзяржаўнай, 2 дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм.

Установы і падраздзяленні БДУ ў 2009 г. выконвалі:

- 146 заданняў 8 праграм Саюзнай дзяржавы, 1 нацыянальнай, 1 прэзідэнцкай, 16 дзяржаўных, 18 дзяржаўных навукова-тэхнічных і 3 галіновых праграм.

- 289 заданняў 15 дзяржаўных комплексных праграм навуковых даследаванняў, 3 дзяржаўных праграм фундаментальных даследаванняў, 9 дзяржаўных праграм арыентаваных фундаментальных даследаванняў, 9 дзяржаўных праграм прыкладных навуковых даследаванняў.

170 заданняў фінансавалася Беларускім рэспубліканскім фондам фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь.

Разам з тым неабходна пашыраць экспартны патэнцыял навукова-тэхнічных распрацовак. У 2009 г. комплексам БДУ пастаўлена навукова-тэхнічнай прадукцыі на экспарт у аб'ёме 1769 тыс. дол. ЗША, гэты паказчык захаваўся на ўзроўні двух папярэдніх гадоў.

У 2010 годзе за кошт уласных сродкаў фінансуецца 29 студэнцкіх навуковых праектаў у аб'ёме 105 млн рублёў. У 2009 г. унесены змены ў Палажэнне аб конкурсе на найлепшыя навуковыя працы студэнтаў БДУ, якімі прадугледжана грашовая ўзнагарода для 16 студэнтаў у памеры да 30% ад велічыні прэмій імя А.Н. Сеўчанкі і У.І. Пічэты. Палажэннем аб конкурсе на найлепшую СНДЛ, прынятым у 2010 г., павялічаны памеры матэрыяльнага стымулявання навуковых кіраўнікоў і студэнтаў, якія эфектыўна працуюць, да 25 тарыфных ставак першага разраду. На фінансаванне камандзіровак студэнтаў на навуковыя канферэнцыі ў бягучым годзе вылучана 6 млн руб. з уласных сродкаў. 1 013 студэнтаў з 6 103, якія ўдзельнічалі ў НДРС у 2009 г., прымалі ўдзел у выкананні планавых дзяржбюджэтных і гасдамоўных тэм, з іх 388 чал. з аплатай.

У рэспубліканскім конкурсе навуковых прац студэнтаў ВНУ ў 2009 г. сярод студэнтаў БДУ было 5 лаўрэатаў конкурсу, 40 прац атрымалі першую катэгорыю, 52 – другую, 64 – трэцюю. У конкурсе навуковых грантаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь з 21 праекта студэнтаў і аспірантаў БДУ фінансавую падтрымку атрымалі 15 праектаў.

Усяго БДУ мае 251 міжнародную дамову аб супрацоўніцтве, з іх у 2009 г. падпісана 36. Вырас аб'ём экспарту адукацыйных паслуг, за справаздачны перыяд ён склаў 3 674 тыс. дол. ЗША.

Працягваліся працы па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы. У 2009 г. колькасць камп'ютараў, занятых у навучальным працэсе, склала 2 441 адз., рост на 66 адз.

У мэтах узмацнення матэрыяльнага забеспячэння ідэалагічнай і выхаваўчай працы ў 2009–2010 навуч. г. былі вылучаны кожнаму факультэту на яе арганізацыю па 2 млн руб., а таксама дадатковыя сродкі для стымулявання працы куратараў.

Ідэалагічная і выхаваўчая праца ў 2009–2010 навуч. г. праводзілася ў адпаведнасці з зацверджаным планам і была накіравана на фарміраванне ў студэнтаў адказнай грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму, добрасумленнага стаўлення да вучобы. Былі праведзены традыцыйныя конкурсы: «Студэнт года» (па намінацыях: «Лідар», «Навука», «Спорт», «Культура»), «Выпускнік года», «Студэнцкі лідар года», «На найлепшую малатыражную студэнцкую газету», конкурс-выстава фотаработ «БДУ ў маім фармаце», конкурсы-віктарыны, прысвечаныя Дню заснавання ўніверсітэта і Дню Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

У 2009 г. студэнтамі БДУ на спаборніцтвах чэмпіянатаў свету і Еўропы заваявана 13 медалёў, з іх 1 залаты, 4 сярэбраныя і 8 бронзавых.

Колькасць членаў пярвічнай арганізацыі ГА «БРСМ» БДУ на 1 лютага 2010 г. складала 5 967 чалавек; колькасць членаў пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў складала 16 833 чалавекі.

Вучоны савет вырашае:

1. Калектыву ўніверсітэта працягнуць працу па завяршэнні рэалізацыі мерапрыемстваў Праграм развіцця БДУ (2005–2011 гг.) і Плана перспектыўнага развіцця ўніверсітэта на 2006–2010 гг.

2. Рэктарату БДУ:

2.1. да 15 кастрычніка 2010 г. сумесна з Цэнтрам праблем развіцця адукацыі (Самахвал В.В.) распрацаваць праект Праграмы развіцця БДУ на 2011–2015 гг., (адк. Жураўкоў М.А.), прадугледзеўшы ў ёй комплекс захадаў па:

а) актывізацыі прафарыентацыйнай працы;

б) павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, надаўшы асаблівую ўвагу працы з першакурснікамі;

в) стварэнні адзінага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя;

г) актывізацыі навукова-інавацыйнай дзейнасці, павелічэнні экспарту навукова-тэхнічных распрацовак;

д) распрацоўцы падпраграмы «Кадры» з мэтай прыцягнення таленавітай моладзі на педагагічную і навуковую працу;

е) аптымізацыі штатнага раскладу комплексу БДУ і яго структуры;

ё) удасканаленні сістэмы аплаты працы ПВС, у т.л. за кошт прыцягнення пазабюджэтных сродкаў;

ж) павышэнні эфектыўнасці і аператыўнасці забеспячэнскай і гаспадарча-рамонтнай дзейнасці адміністрацыйна-гаспадарчых службаў комплексу БДУ;

2.2. да 1 снежня 2010 г. дапрацаваць праект Праграмы развіцця БДУ на 2011–2015 гг. з улікам прапаноў саветаў факультэтаў і іншых структурных падраздзяленняў комплексу БДУ (адк. Жураўкоў М.А.). Унесці праграму для зацвярджэння на Вучоным савеце БДУ (снежань 2010 г.);

2.3. узяць пад кантроль падрыхтоўку праектаў заданняў дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. (адк. Івашкевіч А.А.);

2.4. забяспечыць дасягненне мэт у галіне якасці на 2010 г. (адк. Жураўкоў М.А.);

2.5. разгледзець пытанне аб вылучэнні на конкурснай аснове 10–15 грантаў для выкладчыкаў, якія распрацоўваюць электронныя ВМК (да 6 млн руб. у выглядзе дадатковых надбавак або прэмій у год на адзін ВМК) (адк. Клюня У.Л., Тоўсцік А.Л.);

2.6. працягнуць у 2010–2011 навуч. г. працу па аптымізацыі структуры і штатаў універсітэта, для чаго правесці дбайны аналіз палажэнняў аб структурных падраздзяленнях і службовых інструкцый адміністрацыйна-кіраўнічага і дапаможнага персаналу, распрацаваных у рамках СМЯ (адк. Жураўкоў М.А.);

2.7. забяспечыць у верасні 2010 г. бясплатны доступ у інтэрнэт навуковым супрацоўнікам БДУ (акрамя супрацоўнікаў юрыдычных асоб, якія ўваходзяць у комплекс БДУ) (адк. Мандрык П.А.);

2.8. забяспечыць аператыўнасць закупак расходных і камплектуючых матэрыялаў па заяўках факультэтаў і іншых структурных падраздзяленняў, праводзіць першачарговыя закупкі навучальна-лабараторнага і навуковага абсталявання для арганізацыі навучальнага працэсу і навуковых даследаванняў у навучальных падраздзяленнях пры адкрыцці падрыхтоўкі студэнтаў па новых спецыяльнасцях (адк. Рагавіцкі У.В.).

3. Упраўленню кадраў (Няпеўная Н.Т.) сумесна з кіраўнікамі структурных падраздзяленняў да 30.11.2010 г. правесці аналіз і пры неабходнасці занесці змены ў спісы рэзерву кадраў і распрацаваць праграмы павышэння кваліфікацыі ў галіне адміністрацыйна-кіраўнічай дзейнасці маладых супрацоўнікаў (адк. Жураўкоў М.А.).

4. Галоўнаму ўпраўленню вучэбнай і навукова-метадычнай працы (Хухлындзіна Л.М.):

4.1. сумесна з дэканатамі і кіраўніцтвам навучальных падраздзяленняў працягнуць працу па адкрыцці падрыхтоўкі кадраў па новых спецыяльнасцях і спецыялізацыях для інавацыйнай эканомікі краіны, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі спецыялістаў;

4.2. сумесна з Рэдакцыйна-выдавецкім саветам (Клюня У.Л.), Фундаментальнай бібліятэкай (Лапо П.М.), дэканатамі факультэтаў да 1 снежня 2010 г. распрацаваць план падрыхтоўкі вучэбна-метадычных комплексаў і аўтарскіх курсаў лекцый на перыяд 2011–2015 гг. на папяровых або электронных носьбітах, прадугледзеўшы поўнае забеспячэнне імі навучальнага працэсу;

4.3. сумесна з ЦІТ (Варатніцкі Ю.І.) завяршыць у 2010–2011 гг. распрацоўку і ўкараненне аўтаматызаванай падсістэмы «Нагрузка і штаты»;

4.4. да 1 лютага 2011 г. арганізаваць правядзенне маніторынгу выканання мэт у галіне якасці за 2010 г. і маніторынг працэсаў СМЯ;

4.5. сумесна з дэканамі факультэтаў і ЦСПД (Ротман Д.Г.) правесці аналіз задаволенасці працадаўцаў, маладых спецыялістаў (да 15 лістапада 2010 г.) і выпускнікоў (да 1 мая 2011 г.);

4.6. па выніках унутраных аўдытаў, маніторынгаў і практыкі функцыянавання СМЯ занесці прапановы ў Савет па якасці па ўдасканаленні дакументаў СМЯ;

4.7. сумесна з дэканамі і кіраўнікамі адукацыйных устаноў да 15 лістапада 2010 г. распрацаваць рэкламныя матэ-

рыялы пра спецыяльнасці, па якіх вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў, прэзентацыі факультэтаў і інстытутаў.

5. Дэканам факультэтаў і кіраўнікам адукацыйных устаноў:

5.1. забяспечыць павышэнне якасці адукацыйнага працэсу, вывучыць прычыны паніжэння паспяховасці і адлічэння студэнтаў па ўласным жаданні;

5.2. у планах працы па прафарыентацыі навучэнскай моладзі на 2010–2011 навуч. г. прадугледзець мерапрыемствы, якія спрыяюць прыцягненню на вучобу найболей таленавітай моладзі: арганізацыя школ юных, алімпіяды, конкурсы, шэфская праца, рэкламная кампанія з выкарыстаннем друкаваных і электронных СМІ і інш.;

5.3. сумесна з ЦІТ і Фундаментальнай бібліятэкай працягнуць працу па забеспячэнні доступу студэнтаў і выкладчыкаў да электронных сродкаў навучання і іншай інфармацыі, датычнай арганізацыі навучальнага працэсу;

5.4. распрацаваць тыпавыя і навучальныя праграмы для студэнтаў 4-х курсаў у адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі другога пакалення і да 1 мая 2011 г. прадставіць іх для зацвярджэння ў вызначаным парадку;

5.5. да 1 снежня 2010 г. завяршыць працу па размяшчэнні англамоўных інфармацыйных матэрыялаў пра факультэты, стварэнні персанальных старонак выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў;

5.6. да 1 студзеня 2011 г. правесці працу па заключэнні доўгатэрміновых дамоў аб супрацоўніцтве з прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі, якія з'яўляюцца заказчыкамі спецыялістаў і навукова-тэхнічнай прадукцыі, што распрацоўваецца ва ўніверсітэце, уключаючы праходжанне вытворчых і пераддыпломных практык студэнтамі, узаемныя стажыроўкі і павышэнне кваліфікацыі;

5.7. працягнуць працу па забеспячэнні функцыянавання магістратуры на англійскай мове і сумесна з упраўленнем міжнародных сувязяў (Ціханаў У.Ю.) прыняць захады па наборы ў яе студэнтаў з наступнага навучальнага года.

6. Дэканам факультэтаў, кіраўнікам адукацыйных устаноў сумесна з упраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю (Скалабан П.В.), Студэнцкім гарадком (Чарапеннікаў М.Б.) і псіхалагічнай службай (Папок Р.П.):

6.1. прыняць захады па аказанні навучальна-метадычнай і псіхалагічнай дапамогі студэнтам першага курса з мэтай памяншэння тэрмінаў адаптацыі да вучобы ў БДУ і скарачэння адсеву студэнтаў;

6.2. уключаць куратарскія і інфармацыйныя гадзіны ў расклад навучальных заняткаў; асаблівую ўвагу надаць прафілактыцы супрацьпраўных паводзін студэнтаў, фарміраванню ў іх прававой і палітычнай культуры; для правядзення куратарскіх і інфармацыйных гадзін прыцягваць прадстаўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання, устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый;

6.3. арганізаваць індывідуальную працу са студэнтамі, накіраваную на фарміраванне ў іх адказнай грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму, прававой, палітычнай і інфармацыйнай культуры ў адпаведнасці з дзяржаўнай моладзевай палітыкай.

7. Інстытуту журналістыкі (Дубовік С.В.) сумесна з дэканамі факультэтаў і кіраўнікамі адукацыйных устаноў забяспечыць педагагічнае суправаджэнне дзейнасці студэнцкіх СМІ (адк. Клюня У.Л.).

8. Тэлевізійнаму цэнтру ў 2010 г. працягнуць працу па эксперыментальным паказе тэлепраграм «УніверсітэтТБ» з перспектывай пераходу ў 2011 г. на вяшчанне ў сеткі БДУ і рэгулярнае вяшчанне з інтэрнэт-сайта БДУ.

9. Вучоным саветам факультэтаў да 1 лістапада 2010 г.:

9.1. абмеркаваць на пасяджэннях дадзенае рашэнне і вызначыць захады па яго рэалізацыі;

9.2. абмеркаваць праект Праграмы развіцця БДУ на 2011–2015 гг. і ўнесці прапановы па яе дапрацоўцы.

ПРАЕКТЫ

MBA на беларускі манер

У БДУ дадзены старт новаму міжнароднаму адукацыйнаму праекту.

Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій прыступае да рэалізацыі доўгатэрміновага міжнароднага праекта ў сферы адукацыі – стварэння ў Беларусі першай англамоўнай магістарскай праграмы па спецыяльнасці «Бізнес-адміністраванне» (Праграмы МБА). Ідэя і этапы гэтага важнага для нашай краіны праекта абмяркоўваліся на Міжнароднай донарскай канферэнцыі, якая адбылася 22 верасня ў БДУ.

У канферэнцыі бралі ўдзел кіраўнікі і прадстаўнікі дыпламатычных місій шэрага замежных дзяржаў – Германіі, Вялікабрытаніі, Венгрыі, Ізраіля, Латвіі, Літвы, Польшчы, Славакіі, Паўднёвай Карэі, ЗША, а таксама міжнародных арганізацый – Еўрапейскай камісіі, Савета міністраў паўночных краін, АБСЕ, ПРААН і інш.

Рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка адзначыў стратэгічную мэту форуму – аб'яднаць намаганні айчынных і замежных партнёраў для стварэння ў Беларусі фінансава ўстойлівай праграмы МБА, акрэдытаванай міжнароднымі арганізацыямі, а таксама выказаў спадзяванне, што канферэнцыя дазволіць сфарміраваць партнёрскую кааліцыю, якая ўнясе значны ўклад у рэалізацыю гэтага маштабнага праекта.

Таксама слова бралі першы намеснік міністра адукацыі А.І. Жук, намеснік міністра замежных спраў Беларусі В.І. Варанецкі, Часовы Павераны ў справах ЗША ў Беларусі Майкл Скэнлан, прадстаўнік МЗС Латвіі Майра Мора і інш. Базавую канцэпцыю, асноўныя прынцыпы і этапы рэалізацыі праграмы МБА прадставіў дырэктар ІБМТ БДУ прафесар У.У. Апанасовіч. Праект распрацаваны ў супрацоўніцтве з Рыжскай школай бізнесу і фондам «Еўразія».

Выступоўцы неаднаразова падкрэслівалі, што ў выніку выканання гэтага адукацыйнага праекта будзе нададзены новы імпульс працэсу збліжэння беларускай практыкі вядзення бізнесу з еўрапейскай. Англамоўная праграма МБА будзе таксама спрыяць найбольш хуткай інтэграцыі Беларусі ў еўрапейскую адукацыйную прастору.

Для рэалізацыі праграмы ўжо зроблены першыя важныя крокі. БДУ перадаў Інстытуту бізнесу і менеджменту тэхналогій ў бязвыплатнае карыстанне навучальны корпус па вул. Маскоўская, 5, які плануецца капітальна адрамантаваць. 23 верасня 2010 г. у Рызе было падпісана Пагадненне паміж Урадам Латвійскай Рэспублікі і Урадам Рэспублікі Беларусь «Аб супрацоўніцтве ў сферы падрыхтоўкі кіраўнічых кадраў у магістратуры». Урад ЗША разглядае пытанне аб выдзяленні пад праект спецыяльнай донарскай дапамогі.

У выніку паспяховага выканання адукацыйнага праекта МБА будзе створана ўнікальная айчынная платформа для падрыхтоўкі прафесійных кіраўнікоў, здольных прымаць эфектыўныя рашэнні ва ўмовах канкурэнцыі і глабальных рынкавых адносін.

Выпуск MBA–2010

Наталля КЕЗІК

ПРЭЗЕНТАЦЫІ

НА СТАЖЫРОЎКУ Ў БУНДЭСТАГ

Прэзентацыя міжнароднай парламенцкай стыпендыі германскага бундэстага адбылася 21 верасня ў БДУ.

Мерапрыемства прайшло ў рамках адборачнага тура на атрыманне стыпендыі на 2011 год. Прадставілі адукацыйны праект дэпутат бундэстага Бернд Шэлен, начальнік упраўлення апарата бундэстага Інэс Мокенхаўпт-Гордан, кіраўнік цэнтральнага аддзела па супрацоўніцтве Берлінскага тэхнічнага ўніверсітэта Ульрыка Штратэ.

Штогод у праграме Міжнароднай парламенцкай стыпендыі ўдзельнічаюць каля 120 стыпендыятаў з 28 краін. Выпускнікі ВНУ змогуць атрымаць практычны досвед у сферы дзяржаўнага кіравання і парламенцкай дзейнасці падчас 15-тыднёвай стажыроўкі ў аднаго з дэпутатаў нямецкага парламента. Акрамя таго, стыпендыяты атрымаюць магчымасць браць удзел у навучальных мерапрыемствах аднаго з трох берлінскіх універсітэтаў.

Дакументы прымаюцца да 30 чэрвеня 2011 г. пасольствам ФРГ у Мінску па адрасе: вул. Захарава, 26, тэл.: 217 59 00, факс: 294 85 52; *e-mail: info@minsk.diplo.de*

Больш падрабязную інфармацыю аб умовах праграмы можна знайсці на сайце германскага бундэстага *www.bundestag.de/ips*

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Інтэрв'ю рэктара БДУ акадэміка Сяргея Абламейкі «Не миллионеры, а альтруисты» пра падрыхтоўку навуковых кадраў у аспірантуры – «Рэспубліка» (18.09); tut.by («Как поднять престиж аспирантуры?» 19.09).

Дні нямецкай навукі – БелТА (05.10); БелаПАН (05.10); 21.by (05.10); tut.by (05.10); sb.by (05.10).

Падрыхтоўка кадраў для будучай АЭС на хімічным факультэце БДУ – «Настаўніцкая газета» (05.10).

Пра кафедру мытнай справы – «Знамя юности» (01.10).

Дамовы аб супрацоўніцтве БДУ з Далянскім політэхнічным універсітэтам – БелаПАН (27.09); «Минск-Новости» (27.09); sb.by (28.09); БелТА (28.09); «Знамя юности» (01.10); «Вечерний Минск» (05.10).

Рэгістрацыя на рэпетыцыйнае тесціраванне ў БДУ – БелаПАН (24.09); naviny.by (24.09); sb.by (27.09).

Перамога студэнта 5 курса філалагічнага факультэта БДУ Улада Парыцкага ў «Сваёй гульні» і атрыманне ім Кубка Еўропы – tut.by (21.09); БелТА (22.09).

Пра наступленне астранамічнай восені распавядае дырэктар абсерваторыі БДУ Альгерд Кузнечык – 21.by (22.09); «Рэспубліка» (22.09); zn.by (23.09).

Прэзентацыя ў БДУ міжнароднай парламенцкай стыпендыі германскага бундэстага – «Минск-Новости» (21.09); ng.by (22.09).

Інтэрв'ю з дэканам факультэта міжнародных адносін Віктарам Шадурскім, прысвечанае 15-годдзю ФМА – «Советская Белоруссия» (21.09); «Народная газета» (01.10); 21.by (01.10).

Міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар-2010» –«Вечерний Минск» (20.09; 28.09; 29.09; 30.09; 05.10); БелТА (27.09); БелаПАН (27.09); naviny.by (27.09); tut.by (27.09; 28.09); Інтэрфакс (22.09); «Настаўніцкая газета» (28.09); 21.by (27.09; 02.10); «Ежедневник» (27.09); «Рэспубліка» (29.09); «ЛіМ» (01.10); «Советская Белоруссия» (02.10).

Адкрыццё англамоўнай магістарскай праграмы для спецыяльнасці «Бізнес-адміністраванне» ў Інстытуце бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ – БелТА (18.09); open.by (19.09).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: тэхналогій камунікацыі, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, нямецкага мовазнаўства;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: лазернай фізікі і спектраскапіі, рускай мовы;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: атамнай фізікі і фізічнай інфмарматыкі, дыферэнцыяльных ураўненняў, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, інфарматыкі, радыёфізікі, фізічнай электронікі і нанатэхналогій, фізічнай хіміі, агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі, эканамічнай геаграфіі замежных краін, культуралогіі, класічнай філалогіі, псіхалогіі, філасофіі і метадалогіі навукі, нямецкай мовы, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, грамадзянскага права, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, экалагічнага і аграрнага права, крыміналістыкі, банкаўскай і фінансавай эканомікі, фізічнага выхавання і спорту, гісторыі беларускай мовы, гісторыі беларускай літаратуры;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай матэматыкі і інфарматыкі, агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі, тэорыі і практыкі перакладу, прыкладной лінгвістыкі, класічнай філалогіі, крыніцазнаўства, нямецкай мовы, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, крымінальнага права, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, паліталогіі, банкаўскай і фінансавай эканомікі, фізічнага выхавання і спорту, англійскага мовазнаўства;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі, тэорыі і практыкі перакладу, англійскага мовазнаўства, нямецкага мовазнаўства, прыкладной лінгвістыкі, тэорыі літаратуры, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, канстытуцыйнага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крыміналістыкі, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, раманскага мовазнаўства;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай фізікі, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, глебазнаўства і геалогіі, высокамалекулярных злучэнняў, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул.Бабруйская, 5-а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

ДУА «ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ І МЕНЕДЖМЕНТУ ТЭХНАЛОГІЙ»

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: бізнес-адміністравання, лагістыкі, эканомікі і фінансаў, бізнес-камунікацый, менеджменту тэхналогій

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: бізнес-камунікацый, менеджменту тэхналогій

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Заявы прымаюцца на адрас:
г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 4, каб. 205, тэл. 210-41-06.
e-mail: SBMT@BSU.BY, www.sbmt.by

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

- Загадчыка кафедры прававых дысцыплін (1)
- Старшага выкладчыка кафедры прававых дысцыплін (2)
- Выкладчыка кафедры сацыяльнай работы (1)

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 306-00-27, 306-00-28.

ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н. СЕЎЧАНКІ БДУ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ

- Загадчыка лабараторыі оптыка-фізічных вымярэнняў.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання.

Дакументы дасылаць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7.
Тэл.: 212-48-43.

ВІНШУЕМ!

Віктар ШАДУРСКІ: «ЗА 15 ГАДОЎ ЗРОБЛЕНА КАЛАСАЛЬНАЯ ПРАЦА»

Факультэт міжнародных адносін БДУ адсвяткаваў сваё 15-годдзе. На старонках нашай газеты дэкан ФМА прафесар Віктар ШАДУРСКІ распавёў пра здабыткі і перспектывы аднаго з найбуйнейшых навучальных падраздзяленняў універсітэта.

1 кастрычніка 1995 г. рэктар БДУ акадэмік Ф.М. Капуцкі падпісаў загад аб стварэнні ФМА. Гэта рашэнне стала вельмі перспектыўным. Варта адзначыць, што да гэтага часу ў ФМА ўжо існавала трохгадовая перадгісторыя. У верасні 1992 г. на гістарычным факультэце было створана аддзяленне «міжнародныя адносіны», у верасні 1993 г. – на юрыдычным факультэце – аддзяленне «міжнароднае права», у верасні 1994 г. на філасофска-эканамічным факультэце ўзнікла аддзяленне «міжнародныя эканамічныя адносіны».

Узнікненне міжнародных аддзяленняў, а затым і асобнага факультэта міжнародных адносін БДУ стала магчымым толькі са здабыццём незалежнасці Беларусі. Таму ФМА БДУ – гэта вынік суверэннага развіцця нашай краіны і, калі дазволіце, адзін з сімвалаў незалежнасці. Стаўшы суб'ектам міжнароднага права, Беларусь атрымала магчымасць не толькі самастойна вызначаць сваю міжнародную палітыку, але і рыхтаваць кадры для яе забеспячэння.

Таму пастаяннай задачай факультэта з'яўляецца навучыць студэнтаў выразна разумець і фармуляваць нацыянальныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь, і самае галоўнае – адстойваць іх усімі высакароднымі спосабамі.

ФМА стваралася практычна на маршы. Дзякуючы энергіі і талентам Аляксандра Віктаравіча Шарапы, яго невялікай згуртаванай каманды, актыўнай дапамозе рэктарата, іншых факультэтаў БДУ, міністэрстваў і ведамстваў краіны, факультэт стаў развівацца хуткімі тэмпамі.

Важным этапам стаў пераезд ФМА ў 1997 г. у адрамантаваны будынак па вуліцы Акадэмічнай, 25.

За 15 гадоў зроблена каласальная праца. Цяпер факультэт вядзе навучанне па 8 спецыяльнасцях. Вучэбны працэс забяспечаны навучальнай і навуковай літаратурай. Выкладаецца 16 замежных моў, у тым ліку кітайская, карэйская, японская, турэцкая, персідская, арабская.

За апошняе дзесяцігоддзе супрацоўнікамі абаронена 8 доктарскіх і 40 кандыдацкіх дысертацый. Сёння яны складаюць аснову выкладчыцкага корпуса факультэта. Такім чынам, створаны не толькі высокапрафесійны калектыў, але і навуковыя школы па розных кірунках міжнародных адносін.

Кожны год супрацоўнікі ФМА публікуюць сотні навуковых прац, уключаючы манаграфіі, у тым ліку за мяжой. З часткай з можна было пазнаёміцца на выставе ў холе. На ФМА выдаецца «Журнал международного права и международных отношений». Добрым падарункам да 15-годдзя стаў выхад першага выпуску «Прац ФМА».

ФМА стаў вядомым брэндам не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Гэты поспех можна растлумачыць некалькімі прычынамі. Зразумела, што адной з галоўных прычын высокай цікавасці абітурыентаў да нашых спецыяльнасцяў з'яўляецца імкненне маладых людзей атрымаць гуманітарную адукацыю, авалодаць дзвюма і больш замежнымі мовамі, каб па заканчэнні БДУ працаваць у прэстыжнай сферы замежных сувязяў.

Другая прычына – годная якасць адукацыі на ФМА, укараненне сучасных метадаў і сродкаў навучання, добразычлівая атмасфера ў працоўным калектыве. Нярэдкія выпадкі, калі на факультэт паступаюць малодшыя браты і сёстры выпускнікоў.

Трэцяя прычына высокай прывабнасці ФМА – добрая рэпутацыя нашых выпускнікоў, якіх ужо налічваецца больш за 4 тысячы. Пераважная большасць з іх выдатна зарэкамендавала сябе ў розных сферах.

Таму чуткі пра тое, што выпускнікі ФМА сядзяць без працы або што на ФМА рыхтуюць нявестаў для замежных жаніхоў, з'яўляюцца вынікам, як бы мякчэй выказацца, пэўнай некампетэнтнасці.

Вакол факультэта традыцыйна круцяцца некаторыя чуткі і няслушныя ўяўленні. Існуе стэрэатып, што факультэт рыхтуе спецыялістаў выключна для дыпламатычнай службы Беларусі, г. зн. для МЗС Рэспублікі Беларусь. Адказ просты, ён змяшчаецца ў пераліку спецыяльнасцяў ФМА. Мы рыхтуем спецыялістаў для дыпламатыі, але ў большай ступені для арганізацыі міжнароднага супрацоўніцтва розных устаноў, ведамстваў і прадпрыемстваў.

Дыскусіі вакол рэальных і ўяўных праблем факультэта сведчаць пра тое, што ФМА актыўна працуе. Увага і цікавасць – заўсёды з'ява станоўчая, бо павышае рэйтынг.

Юбілей з'яўляецца добрай падставай пагаварыць пра перспектывы.

1. ФМА марыць перасяліцца ў новы будынак.

2. Факультэт плануе значна большую ўвагу надаваць фарміраванню практычных навыкаў, запатрабаваных будучай прафесіяй. Чым раней студэнт вызначыцца з будучым месцам працы, тым больш рашуча і актыўна ён пачне сваю працоўную кар'еру.

Многае залежыць і ад патэнцыйных працадаўцаў. На наш погляд, працадаўцы, каб прэтэндаваць на запрашэнне найлепшых выпускнікоў, павінны прымаць больш зацікаўлены ўдзел у развіцці навучальнага працэсу і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння навучання ў ВНУ.

3. Складанасць знешнепалітычных і знешнеэканамічных задач, якія вырашае наша краіна, ставіць перад прафесарска-выкладчыцкім складам задачу павысіць экспертны ўзровень навуковых даследаванняў, павялічыць колькасць публікацый у аўтарытэтных замежных выданнях, перш за ўсё англамоўных. Дэканат плануе стварыць у рамках факультэта інфармацыйна-аналітычныя групы па буйных краінах, па групах краін, а таксама асноўных глабальных праблемах.

4. Сур'ёзна думаем пра стварэнне на ФМА сістэмы другой вышэйшай адукацыі па скарочанай праграме, сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў на камерцыйнай аснове. Гэта мы зможам у поўнай меры рэалізаваць пасля паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы факультэта.

Такіх вынікаў ФМА не змог бы дасягнуць без пастаяннай падтрымкі рэктарата, усіх службаў універсітэта, салідарнасці і ўзаемнай дапамогі іншых факультэтаў, суладнай працы калектыву факультэта. Без гэтай падтрымкі немагчыма рэалізаваць і перспектывы.

З Днём нараджэння, ФМА!

Цяперашні будынак факультэта міжнародных адносін на Акадэмічнай, 25

ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

Датай стварэння факультэта міжнародных адносін прынята лічыць 1 кастрычніка 1995 г. У першы год на факультэце функцыянавала пяць кафедраў. У далейшым іх колькасць павялічылася да трынаццаці. На ФМА выкладаюцца дзясяткі дысцыплін і праводзіцца навуковая і даследчая дзейнасць па шасці кірунках. За 15 гадоў факультэт міжнародных адносін стаў вядомым і паважаным навучальным падраздзяленнем БДУ.

Цяпер на факультэце навучаюцца звыш 2,5 тысяч студэнтаў, у тым ліку 274 замежныя грамадзяніны. ФМА падрыхтаваў каля 4 тысяч спецыялістаў. 20 % супрацоўнікаў Міністэрства замежных спраў Беларусі з'яўляюцца выпускнікамі ФМА.

На кафедрах факультэта працуюць вядомыя навукоўцы, адзначаныя прэстыжнымі айчыннымі і міжнароднымі прэміямі. Склаліся навуковыя школы як вынік распрацоўкі і ўкаранення прадуктыўных даследчых праграм. Усяго на ФМА працуюць больш за 180 выкладчыкаў, у тым ліку 12 прафесараў, дактароў навук і каля 60 дацэнтаў, кандыдатаў навук. Выкладчыкамі факультэта падрыхтаваны дзясяткі навучальных дапаможнікаў і навуковых прац.

СЁННЯ Ў НАШАЙ ХАЦЕ СВЯТА...

З нагоды 15-годдзя ФМА з 25 па 30 верасня прайшлі святочныя мерапрыемствы.

Пачынам стала сустрэча больш як 120 выпускнікоў. Іх прывітаў дэкан ФМА прафесар Віктар Шадурскі, які выказаў спадзяванне на ўсталяванне традыцыі такіх сходаў і акрэсліў перспектывы стварэння асацыяцыі выпускнікоў факультэта. Госці абмяняліся ўспамінамі пра студэнцкія гады і падзяліліся сваімі поспехамі ў прафесійнай дзейнасці. Студэнты факультэта прадэманстравалі адмыслова падрыхтаваны фільм пра гісторыю стварэння ФМА. І, вядома ж, узгадалі тых асоб, чые прафесійныя поспехі пацвярджаюць высокі статус факультэта. Яго выхаванцы працуюць у Міністэрстве замежных спраў Беларусі, іншых міністэрствах і ведамствах, міжнародных арганізацыях.

Сярод святочных мерапрыемстваў прыкметна вылучалася выстава творчых прац выкладчыкаў і супрацоўнікаў, якія ў поўнай меры адлюстравалі незвычайнасць і неардынарнасць людзей, што працуюць на факультэце міжнародных адносін. Акрамя таго, была адкрыта экспазіцыя публікацый ФМА з шырокім спектрам навучальнай літаратуры, падрыхтаванай і выдадзенай кафедрамі факультэта.

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

Шчырыя віншаванні ад усіх факультэтаў і інстытутаў БДУ

Напярэдадні знамянальнай даты выйшаў 1-ы выпуск «Прац факультэта міжнародных адносін БДУ».

У рамках праграмы прайшлі ўжо традыцыйныя «Дыпламатычныя сустрэчы». У іх бралі ўдзел ветэраны айчыннай дыпламатычнай службы Я.К. Вайтовіч, С.С. Агурцоў і В.М. Фісенка, а таксама выпускнікі ФМА, якія працуюць у МЗС РБ. Галоўнай мэтай сустрэчы было абмеркаванне перспектыў супрацоўніцтва і паляпшэння якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. Працягам мерапрыемства стала правядзенне так званых майстар-класаў ужо ў аўдыторыях са студэнтамі.

30 верасня ў актавай зале Інстытута журналістыкі прайшоў урачысты сход, які завяршыў святочныя мерапрыемствы. Свята сабрала прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў нашай краіны, дыпламатаў, дэканаў факультэтаў БДУ. Афіцыйную частку адкрыў дэкан ФМА В.Г. Шадурскі. Затым выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэта павіншавалі першы прарэктар БДУ прафесар М.А. Жураўкоў, намеснік міністра замежных спраў В.І. Варанецкі, першы намеснік міністра юстыцыі А.В. Білейчык, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях А.П. Русецкі, кіраўнік Дэпартамента турызму Міністэрства спорту і турызму А.У. Салаўёва, начальнік упраўлення кадраў і падрыхтоўкі асабістага складу мытных органаў Дзяржаўнага мытнага камітэта В.П. Шостак, начальнік упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Дзяржаўнага мытнага камітэта Ю.А. Фёдараў, протаіерэй А. Шымбалёў, дэканы факультэтаў і кіраўнікі падраздзяленняў БДУ. Таксама адбылося ўзнагароджанне прафесарска-выкладчыцкага складу ФМА ганаровымі граматамі і падарункамі. Завяршылася свята канцэртам, падрыхтаваным студэнтамі факультэта. Далей размова з гасцямі працягнулася ўжо ў нефармальных абставінах, дзе таксама прагучала шмат цёплых слоў і пажаданняў ФМА, у тым ліку і ад яго былых кіраўнікоў – прафесара Аляксандра Шарапы і Людмілы Хухлындзінай, якія стаялі ля вытокаў слаўнага падраздзялення.

дацэнт Вольга ЛАЗОРКІНА

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

Дэкады беларускага фальклору

Найважнейшай задачай вышэйшай школы на сучасным этапе развіцця з'яўляецца павышэнне якасці адукацыі і ўдасканаленне вучэбнага працэсу. Гэта патрабуе перагляду традыцыйнай стратэгіі навучання, пошуку новых рэзерваў і ракурсаў выкладання такой значнай у сістэме прафесійнай падрыхтоўкі філолага дысцыпліны, як фалькларыстыка. Народная творчасць не толькі найбагацейшы ідэйна-эстэтычны скарб, створаны многімі пакаленнямі, але і аснова развіцця прафесійнага мастацтва і літаратуры. Вывучэнне фальклорнай спадчыны беларусаў з'яўляецца важным падмуркам дзяржаўнай ідэалогіі, адыгрывае вялікую ролю ў патрыятычным і культурным выхаванні і развівае пачуццё грамадскай свядомасці і нацыянальнай самасвядомасці. Менавіта гэтаму надае шмат увагі кіраўніцтва нашай краіны.

Як слушна адзначыў прарэктар БДУ прафесар У.Л. Клюня, на філалагічным факультэце, дзякуючы намаганням фалькларыстаў кафедры тэорыі літаратуры (загадчык – д.ф.н. прафесар В.П. Рагойша), працы вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору (загадчык – к.ф.н. дацэнт Т.А. Марозава), створаны сапраўдны асяродак беларусазнаўства, які, па сутнасці, з'яўляецца асновай выхавання ўніверсітэцкай моладзі.

Пацвярджэннем гэтага стала правядзенне ў верасні 2010 г. на філалагічным факультэце БДУ комплексу вучэбна-выхаваўчых мерапрыемстваў пад незвычайнай назвай «Тры дэкады беларускага фальклору і фалькларыстыкі», ажыццяўленне якога ініцыявалі дацэнты Рыма Кавалёва, Вольга Прыемка, Таццяна Марозава. За месяц выкладчыкі кафедры тэорыі літаратуры і супрацоўнікі вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору зладзілі 8 акцый. Ідэя іх правядзення з'явілася не на пустым месцы, а на падставе праходжання студэнтамі 1 курса спецыяльнасцяў «Беларуская філалогія», «Руская філалогія» і «Славянская філалогія» першай вытворчай практыкі па фальклоры. Як заўсёды, з дапамогай студэнтаў былі арганізаваны круглы стол «Беларускі фальклор у прасторы і часе нацыянальнай культуры» (15 верасня) і Фальклорны фэст (17 верасня), на якім студэнты па-мастацку прэзентавалі фальклорную спадчыну нашага народа.

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

Старшы выкладчык кафедры тэорыі літаратуры Ізольда Ківель прэзентуе 7-ы выпуск «Фалькларыстычных даследаванняў»

Новай формай стала групавая прэзентацыя справаздач (6–9 верасня), што дазволіла студэнтам праявіць свае аратарскія здольнасці і ацаніць сваю працу «збоку», вачыма іх калег-практыкантаў.

Традыцыйнымі сталі сяброўскія сустрэчы студэнтаў розных краін. Сёлета прайшла сустрэча з кітайскімі і турэцкімі студэнтамі – членамі Клуба інтэрнацыянальнага сяброўства філалагічнага факультэта, якім кіруе старшы выкладчык кафедры тэорыі літаратуры С.І. Крылова, – пад назвай «Беларускі фальклор і ўсходняя мудрасць» (24 верасня). Удзельнікі пазнаёміліся з кнігамі «Китайский календарь и славянские мифологические параллели» і «Слово мудрости восточной» і змаглі задаць пытанні іх аўтарам, доктару філалагічных навук, прафесару, загадчыку кафедры беларускай літаратуры і культуры Т.І. Шамякінай і аматару ўсходняй паэзіі У.С. Малярову.

20 верасня адбылося пашыранае пасяджэнне навукова-метадычнага семінара «Праблемы фалькларыстыкі», у якім прынялі ўдзел студэнты філфака, члены НДЛ «Фалькларыстыка», студэнты гістарычнага факультэта БДУ, якія знаёмяцца са спецыяльным курсам «Этнафалькларыстыка», супрацоўнікі лабараторыі беларускага фальклору і кабінета-музея беларускай народнай культуры філфака, выкладчыкі кафедры тэорыі літаратуры.

22 верасня адбылася сапраўдная падзея – прэзентацыя першага нумара электроннага фальклорна-этнаграфічнага і літаратурна-мастацкага альманаха «Дзьмухавец», які не мае аналагаў на беларускай філалагічнай прасторы. Выданне арыентуе студэнтаў на паглыбленне сваіх ведаў па фальклоры праз падрыхтоўку да напісання розных відаў навукова-творчых работ (эсэ, партфоліа, водгукаў і інш.), а таксама знаёміць з матэрыяламі фальклорнай практыкі (у рэтраспектыве і апошніх гадоў). На старонках альманаха надрукаваліся маладыя паэты і паэткі, а таксама прадставілі сучасны погляд на казкатворчасць аўтары наватвораў у рубрыцы «Філалагічныя гульні» (сайт *www.almanah-dzmuhavec.narod.ru*).

Завяршыліся «Тры дэкады» 30 верасня прэзентацыяй 7 выпуску зборніка артыкулаў «Фалькларыстычныя даследаванні: кантэкст, тыпалогія, сувязі», выданне якога традыцыйна ажыццяўляюць прадстаўнікі фалькларыстычнай навуковай школы БДУ, падтрыманыя калегамі з іншых ВНУ Беларусі і замежжа. Прэзентацыя прайшла ў рэчышчы адказаў на пытанне: што зборнік дае студэнту, выкладчыку, факультэту, універсітэту? Выступілі аўтары артыкулаў – студэнты і выкладчыкі БДУ, прадстаўнікі з іншых навучальных і навуковых устаноў (БДАМ, БДУКМ, НАН РБ), госці.

Без сумнення, мерапрыемствы такога кшталту дапамагаюць вырашаць важныя дзяржаўныя задачы патрыятычнага выхавання моладзі ў РБ і забяспечваць прафесійнае станаўленне філолага як самастойнай асобы з творчым стылем мыслення і высокім узроўнем навуковай, культурнай і ідэалагічнай кампетэнцыі.

дацэнты
Вольга ПРЫЕМКА,
Таццяна МАРОЗАВА

АСОБЫ

VIVAT PROFESSOR NOSTER!

Прафесар кафедры раманскіх моў Нінэль ГАНЧАРОВА нядаўна адсвяткавала юбілей.

У нашым універсітэце Н. А. Ганчарова працуе больш за паўстагоддзя – з 1958 года і атрымала заслужанае прызнанне. З 1991 г. яна з'яўляецца адзіным пакуль у рэспубліцы прафесарам па спецыяльнасці «Класічная філалогія».

З 1978 па 1990 гг. – загадчык кафедры французскай, іспанскай і лацінскай моў, штат якой дасягаў 50 чалавек. Характэрна, што за 13 гадоў яе кіраўніцтва дванаццаць выкладчыкаў абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

Да сферы навуковых інтарэсаў Н. А. Ганчаровай адносяцца лінгвістыка (лексікаграфія, лексікалогія, фразеалогія, лінгвакультуралогія) і методыка выкладання лацінскай мовы.

Наогул, Нінэль Афінагенаўнай апублікавана каля 300 прац. У іх ліку – праграмы, падручнікі, навучальныя дапаможнікі па лацінскай мове для гістарычных і юрыдычных факультэтаў, тэрміналагічныя і фразеалагічныя слоўнікі, як двухмоўныя, так і шматмоўныя.

Творчая і прафесійная актыўнасць Н. А. Ганчаровай не падуладная часу. У гэта дзесяцігоддзе штогод з-пад яе пяра выходзяць не менш за 1-2 кнігі, дзясятак артыкулаў. Яна годна прадстаўляе кафедру на рознага ўзроўню навуковых форумах у нашай краіне і за мяжой.

Інавацыйны, творчы падыход характарызуе Нінэль Афінагенаўну не толькі ў сферы яе навуковай і навукова-метадычнай дзейнасці, але і перш за ўсё ў прафесійнай працы выкладчыка лацінскай мовы. Яе педагагічнае майстэрства, усебаковая эрудыцыя, прывабныя чалавечыя якасці дапамаглі ёй набыць любоў і павагу студэнтаў.

Па ініцыятыве Н. А. Ганчаровай на працягу многіх гадоў на гістарычным факультэце дзейнічае факультатыў па паглыбленым вывучэнні лацінскай мовы з атрыманнем сертыфіката на права быць перакладчыкам лацінамоўнай літаратуры па спецыяльнасці «Гісторыя».

За сваю працу Н. А. Ганчарова неаднаразова ўзнагароджвалася ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі і Савета Міністраў Беларусі, а таксама ўніверсітэта.

Гады ідуць і ідуць – а для яе вучняў Нінэль Афінагенаўна ўсё так жа застаецца эталонам унутранай культуры і самадысцыпліны, надзвычайнага самавалодання і патрабавальнасці да сябе.

Як цяпер мы бачым яе ў аўдыторыі, за кафедрай: заўсёды вельмі падцягнутую, мініяцюрна-далікатную і ў той жа час поўную дзейснай энергіі. У вытанчана-белай блузе і дзелавым, строгіх і разам з тым бездакорна элегантных ліній, касцюме, недасягальна ўзорную – пэўнага кшталту класічны ідэал выкладчыка класічнай філалогіі. Шчодра дорыць студэнтам свае веды і час, захапляе прадметам, у якім яна сапраўдны энцыклапедыст з найшырэйшым культуралагічным кругаглядам.

Сваім цудоўна арганізаваным розумам Нінэль Афінагенаўна заўсёды дапамагала лёгка вырашыць самыя заблытаныя, самыя галаваломныя і мудрагелістыя для студэнта «моўныя загадкі», пераадолець пазнавальныя цяжкасці, перасягнуць бар'еры аддаленай ад нас старажытнасці, якая палохае сваёй веліччу. Нам выпала вялікае шчасце вучыцца ў сапраўды дасведчанага прафесіянала, займаючыся латынню без механічнага зубрэння і прымусу.

Зараз асабліва шмат робіцца для актывізацыі і плённасці навукова-даследчай працы студэнтаў. Паказальна, што з першага курса ўсе гэтыя гады Нінэль Афінагенаўна паспяхова далучала ўчорашніх «жаўтаротых школьнікаў» да навукі – а для многіх гэта стала прысвячэннем і шчаслівым дабраславеннем на ўсё далейшае жыццё. Мы добра памятаем Нінэль Афінагенаўну, гасцінна расхінаюцца для студэнтаў дзверы sacra sacrum, святая святых дома – сваёй фундаментальнай хатняй бібліятэкі, напоўненай так клапатліва падабранай літаратурай: і слоўнікава-інфармацыйнай, і навуковай, і папулярнай...

Дзякуючы намаганням такога закаханага ў свой прадмет выкладчыка, нашы аднакурснікі ўдзельнічалі ва ўніверсітэцкіх навукова-практычных канферэнцыях, што называецца, цэлымі прафесійна-сяброўскімі супольнасцямі. Абуджаючы і ўсімі сіламі ўмацоўваючы творчыя сілы юных студэнтаў, Нінэль Афінагенаўна арганізоўвала традыцыйныя конкурсы на найлепшы мастацкі пераклад вершаванага тэксту, напрыклад, такія, у якіх студэнты маглі дзёрзка «паспаборнічаць з вялікімі» ў літаральным узнаўленні або вольных перакладаннях знакамітага «Exegi monumentum». Атрымлівалася павучальна, гучна і велічна, а часам вельмі весела, як, напрыклад, з такой канцоўкай:

Проходят годы стройной вереницей,
Венок лавровый треплет Аквилон.
А Мельпомена всё понять стремится:
Кто ж должен быть по праву награжден?..

Урокі латыні з Н. А. Ганчаровай пакінулі толькі самыя прыемныя ўражанні. Нінэль Афінагенаўна – абаяльны, інтэлігентны чалавек, які валодае тонкім пачуццём гумару, фундаментальнымі ведамі, адданы філалогіі і верны традыцыям класічнай адукацыі.

І сёння мы хорам кажам і ад усяго сэрца паўтараем:

VIVAT NOSTER PROFESSOR! – НЯХАЙ ЖЫВЕ НАШ ПРАФЕСАР!

BENE VOBIS! – БУДЗЬЦЕ ВА ЎСІМ ШЧАСЛІВАЯ!

AD MULTOS ANNOS! – ШМАТЛІКІХ ГАДОЎ!

Заўсёды ўдзячныя вучні-філолагі

МАЙСТРОЎНЯ

«Тэатральны куфар» ад Шэкспіра да Шэкспіра

З 27 верасня па 2 кастрычніка на сцэнах Палаца прафсаюзаў і ліцэя БДУ дзякуючы арганізаванаму ўпраўленнем па справах культуры БДУ міжнароднаму фэсту «Тэатральны куфар» можна было ўбачыць спектаклі на любы густ – ад традыцыйнай чэхаўскай «Чайкі» да эпатажнай італьянскай пастаноўкі «Дрэнныя людзі ў Гуантанама». Мы, як шчырыя прыхільнікі папулярнага мерапрыемства, вырашылі падзяліцца сваімі ўражаннямі.

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

Калектыў тэатра The Remington project універсітэта Бат Спа з галоўным прызам фестывалю

Настасся: Восень, як вядома, пара кантрастаў. Як узор з залатога лісця ўпрыгожвае шэрае неба, так халодныя мінскія вечары былі расквечаны яркай падзеяй – фэстам студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар». Сёлета ў Мінску сабраліся дзевятнаццаць калектываў з шаснаццаці краін свету. Гэты фэст – падзея, якая сцірае міжнацыянальныя межы, бо мова тэатра зразумелая ўсім, яна адмяняе эфект вавілонскай вежы і вяртае чалавецтву яднанне і паразуменне. Нягледзячы на тое, што вялікая частка спектакляў ішла на замежных мовах, залы былі поўныя. Не было пуста пасля адзінаццаці і ў кавярні «Манга», дзе ладзіўся крытычны клуб: любы ахвотнік мог выказаць сваё меркаванне пра спектакль, пазнаёміцца і пагутарыць з аднадумцамі.

Кацярына: Сёлета фэст сапраўды здзівіў. Усе пастаноўкі былі прасякнуты незвычайна адкрытай пачуццёвасцю. Як заўсёды, былі гісторыі пра пачуцці і пошукі сэнсу жыцця, але падавалася гэта больш не праз дыялогі (якія ў большасці спектакляў наогул былі незразумелымі гледачу з-за моўнага бар'еру), а праз дзейства: танец, рух цела, гарачыню, жаданне. Асабліва выклікала хвалю абмеркаванняў пастаноўка італьянскага тэатра, дзе практычна ўсё дзейства акцёры выступалі голымі. Прычым рух на сцэне пачаўся з уваходам першага гледача ў залу, нібы заклікаючы задумацца: вы жывяце, занятыя сваімі справамі, а гэта адбываецца. Праўда, для нашага менталітэту, напэўна, не зусім ясна, што ж яны мелі на ўвазе, бо перад выглядам чалавечых голых целаў праблемы катаванняў і пакут, якімі спрабавалі ўразіць акцёры, проста сышлі на задні план. Затое абыякавых у зале не засталося.

Настасся: Сёлета меркаванне незалежнага журы, у склад якога ўваходзілі вядомыя замежныя тэатральныя дзеячы, супала з сімпатыямі публікі. Пераможцам фэсту па выніках глядацкага галасавання, а таксама ўладальнікам прыза «За найлепшую рэжысуру» стаў брытанскі спектакль «Чырвоны пакой», пастаўлены тэатрам The Remington project універсітэта Бат Спа.

П'еса, напісаная па матывах твора Анджэлы Картар, апавядае пра рамантычную пісьменніцу, якая выйшла замуж за абаяльнага і загадкавага франта. Напачатку спектакля маладая дзяўчына выяўляе бурнае захапленне з нагоды свайго замужжа. Аднак неўзабаве становіцца зразумела, што мілы муж з'яўляецца «спадкаемцам» падступнай справы Сіняй Барады. Адначасова з гісторыяй галоўнай гераіні на сцэне разгортваліся гісторыі забітых яе мужам жанчын, якія ператварыліся ў прывіды і змушаныя зноў перажываць падзеі сваіх жыццяў. Сюжэт немудрагелісты, але гэта кампенсавалася дзівоснай прыгажосцю пастаноўкі. Статныя маладыя людзі, апранутыя ў капелюшы, камізэлькі і лакавыя туфлі, палілі цыгары, гралі на фартэпіяна і танчылі. Усё гэта яны выраблялі з прывабнай самаўпэўненасцю і элегантнасцю, якімі і захоплівалі дзяўчат у свае сеткі, пасля чаго ператваралі іх існаванне ў сапраўднае пекла. Момант, калі спадары ў капелюшах забівалі сваіх дам са словамі: «Табе трэба трохі адпачыць, мілая», быў асабліва выразны. Галоўнай гераіні, аднак, удалося пазбегнуць лёсу сваіх папярэдніц – яна знайшла спосаб выслізнуць ад жорсткага мужа.

Кацярына: Кожны год мы чакаем чагосьці незвычайнага ў праграме фэставага тыдня, якая складаецца не толькі з заяўленых спектакляў, але і з майстар-класаў, спецыяльных праектаў фэсту і вячорак, дзе можна бліжэй і больш пазнаёміцца з гасцямі і ўдзельнікамі. Сёлета адбыліся чатыры майстар-класы, дзе еўрапейскія майстры тэатра спрабавалі абудзіць ва ўдзельніках мову не толькі голасу, але і цела і духу. Былі і спецыяльныя праекты: «Монок» (пастаноўка монаспектакля), «Koufar-to-stage», «Koufar-in-motion».

У межах апошняга напрыканцы фэсту гледачоў чакала яшчэ адна неспадзеўка: арыгінальная пастаноўка, якая рыхтавалася толькі тыдзень і задзейнічала акцёраў розных труп. Усе яны, нягледзячы на розніцу ў мовах, культурах, кірунках творчасці, пад кіраўніцтвам англійскага рэжысёра Эдварда Льюіса стварылі свой тэатр. Дарэчы, гэты рэжысёр – вучань Аўгуста Бааля, легендарнай асобы ў гісторыі тэатра, які стаў бацькам такіх з'яў, як форум-тэатр і імідж-тэатр.

Доктар Рабер Жарме, прэзідэнт-заснавальнік Міжнароднай асацыяцыі ўніверсітэцкіх тэатраў: «Свет – вялікі, вельмі няпроста абысці ўсе ўніверсітэты, каб паглядзець на тэатральную дзейнасць нашых калег. Менавіта для таго і праводзяцца фестывалі: зрабіць свет крыху меншым, сабраўшы ў адно месца ў адзін час як мага больш «узораў» універсітэцкіх тэатраў. Не магу не павіншаваць і не аддзячыць – у чарговы раз – арганізатарам фестывалю «Куфар» у Мінску за тое, што яны ў сёмы раз далі нам магчымасць з такім камфортам здзейсніць вандроўку па свеце тэатраў у сваім універсітэце.

Кацярына РАМАНАВА,
Настасся ШМІГЕЛЬСКАЯ

У ВОЛЬНЫ ЧАС

Гукі музыкі

«Ты часто говоришь,
что где-то есть Париж,
и он твое заветное желание.
Попасть туда легко,
ведь здесь недалеко
есть агрогородок с таким названием!»

Менавіта гэты вясёлы матыў з рок-н-рольнай песні Мікіты Найдзёнава, студэнта 3 курса факультэта журналістыкі, круціўся ў маёй галаве раніцай 23 верасня. А ўсё таму, што вечар 22 верасня я правяла ва ўтульнай кавярні «Гаўдэамус», дзе праходзіў чарговы фэст студэнцкай песні «Сярэбраныя струны» ў рамках фестывалю студэнцкай творчасці Студгарадка БДУ.

Яшчэ да пачатку мерапрыемства, калі канкурсанты ў глядзельнай зале рэпеціравалі свае нумары, стала ясна, што тут сабраліся таленавітыя, не падобныя адзін да аднаго маладыя людзі, якім ёсць чым здзівіць журы і гледачоў. У склад журы ўвайшлі: беларускія барды Аляксандр Мазанік і Яўген Рыбалтоўскі, кампазітар, вакаліст, гітарыст і заснавальнік гурта NEO Андрэй Маркуц, начальнік псіхалагічнай службы БДУ Руслан Папок і намеснік дырэктара Студгарадка Вольга Яраш. Як адзначыў Руслан Папок, «сёлета ўсе ўдзельнікі, нягледзячы на іх разнастайнасць, былі на аднолькава высокім узроўні», а ён ведае, што гаворыць, бо менавіта ён, працуючы ў Студгарадку БДУ, 12 гадоў таму прыдумаў гэты конкурс.

Конкурс праходзіў у 2 намінацыях: «Аўтар» і «Выканаўца». Склад канкурсантаў быў вельмі стракатым. Хлопцы і дзяўчаты адрозніваліся манерай выканання, жанрам кампазіцыі, выступалі як сольныя спевакі, так і калектывы. Песні выконваліся на беларускай і рускай мовах. Таму, па словах аднаго з членаў журы, пры падвядзенні вынікаў у першую чаргу ўвага звярталася на цэласны вобраз канкурсанта, на тое, як ён здолеў сябе паднесці, журы ацэньвала і выбар рэпертуару, вакальныя даныя, інструментальнае суправаджэнне, выканальніцкае майстэрства.

Намінацыя «Выканаўца»:

дыплом 1 ступені – Скурат Вадзім і Леднік Аляксандр (факультэт радыёфізікі і электронікі);

дыплом 2 ступені – Чарняўская Марыя (біялагічны факультэт);

дыплом 3 ступені – Даніленка Яўген (гуманітарны факультэт).

Намінацыя «Аўтар»:

дыплом 1 ступені – Шаўчук Ганна і Рацкевіч Іван (хімічны факультэт);

дыплом 2 ступені – Шувалаў Уладзімір (факультэт філасофіі і сацыяльных навук);

дыплом 3-й ступені – Кісцень Аляксандр (гуманітарны факультэт).

Мікіта Найдзёнаў

Гран-пры заваяваў згаданы вышэй Мікіта Найдзёнаў, які, па яго словах, з'яўляецца прадстаўніком вельмі рэдкай прафесіі журналіст-музыка. Ён выканаў уласную песню «пра геаграфічную справядлівасць» – «Парыж».

Пасля таго, як былі абвешчаны вынікі і ўручаны ўзнагароды, пераможца падзяліўся сваімі эмоцыямі і планамі на будучыню. Мікіта быў вельмі ўсхваляваны і рады, хоць прызнаўся, што ішоў на конкурс для таго, каб перамагчы. Падкрэсліў, што менавіта гэта выступленне яго трохі пужала, бо Мікіта прывык знаходзіцца на сцэне са сваёй групай, а тут ён граў і спяваў адзін. Зараз пераможца прымае ўдзел у конкурсе «Народны хіт» і плануе стварыць новы творчы калектыў і заваяваць сваёй музыкай як мага больш сэрцаў!

Люба ЮНАШ

СПОРТПЛЯЦОЎКА

Валейбольны БДУ

У вышэйшай лізе чэмпіянату Беларусі па валейболе выступіць каманда БДУ – БАТЭ.

Па словах галоўнага трэнера Івана Шыраева, наша валейбольная каманда раней чатыры разы выйгравала турнір першай лігі, але праз нястачу фінансаў адмаўлялася ад павышэння ў рангу. Гэта стала магчымым пры падтрымцы ад барысаўскага спорткамітэта, дзе на базе вядомага футбольнага клуба БАТЭ вырашылі стварыць аддзел валейбола. Касцяк калектыву складуць гульцы ранейшай каманды БДУ (сярод якіх, дарэчы, два студэнты), а таксама члены юнацкай зборнай краіны, якая выступала нядаўна на чэмпіянаце Еўропы. Каманда будзе трэніравацца і аднаўляцца на базе спарткомплексу БДУ, а хатнія матчы праводзіць у Барысаве.

Зразумела, што для дэбютанта такіх спаборніцтваў мэты на першы год будуць прыземленыя – замацавацца ў спартыўным рэестры і наладзіць функцыянаванне. Затым плануецца якаснае ўзмацненне і рашэнне іншых задач: траплянне ў прызёры і заваяванне права на ўдзел у еўракубках.

Вырашаецца пытанне захавання ўніверсітэцкай каманды па месцы ранейшай «прапіскі» – у першай лізе. Гэта дало б магчымасць рыхтаваць уласныя рэзервы, а таксама задзейнічаць шматлікіх энтузіястаў гэтай гульні, якія не могуць выступаць сярод прафесіяналаў.

Якуп БЯШЫМАЎ

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

12 кастрычніка 2010 года
Падпісана да друку 8.10.2010 г.
Зак. . Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 2,5.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспект Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by

ВІКТАРЫНА

ПАПАРАЦЬ-КВЕТКА ЗАЦВІТАЕ ДЛЯ ЦЯБЕ Ў БДУ

Дарагія нашы першакурснікі!
Студэнты старэйшых курсаў!
Сябры!

Стала ўжо добрай традыцыяй напярэдадні Дня нараджэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта праводзіць «Віктарыну» на найлепшае веданне гісторыі роднай alma mater, Вашай сённяшняй, якая стала для кожнага жаданай і дарагой вышэйшай навучальнай установы. Вы сёння самыя шчаслівыя! «Шчасце ёсць найлепшы ўніверсітэт», – пісаў А. С. Пушкін.

Кожны з Вас, паважаныя сябры-студэнты, ні на хвіліну ніколі не зможа ўсумніцца ў правільнасці выбару сваёй ВНУ, ніхто з Вас ні за што не захоча, што б там ні было, хоць калі-небудзь прамяняць сваю вышэйшую школу на іншую.

БДУ ўвайшоў у Ваша жыццё трывала і надоўга. У тым, што гэта так, Вы зможаце пераканацца неаднойчы ў студэнцкіх аўдыторыях, на вечарах, у адносінах са сваімі калегамі, з прафесарска-выкладчыцкім складам. Ва ўніверсітэце традыцыйна ўсталяваліся самыя дэмакратычныя, але і патрабавальныя ўзаемаадносіны паміж выкладчыкамі і студэнтамі. Тут ёсць усе мажлівасці для вучобы, набыцця, у першую чаргу, прафесійных ведаў: добрая аснашчанасць, трывалая матэрыяльна-тэхнічная база, выдатныя педагогі высокай кваліфікацыі. У БДУ даўнія і моцныя традыцыі ў спасціжэнні разнастайнасці падыходаў да навучання, у распаўсюджанні кампетэнцый у самых розных сферах навукі і тэхналогій. Прафесійная падрыхтоўка неад'емна звязана з навуковым самастойным пошукам і знаходкамі, адкрыццямі, з навукова-даследчай працай студэнтаў. Найлепшыя і найтрывалейшыя веды – тыя, якія здабудзеш сам, да якіх Вы прыйдзеце самастойным шляхам.

Варта быць захопленым навукай, даследаваннямі, вучобай, каб вылучыцца са свайго асяроддзя, весці за сабой іншых.

Неабходна выпрацоўваць у сабе лідарскія якасці, не баяцца ўзяць на сябе адказнасць за заўтрашні дзень сваёй краіны і свой асабісты лёс.

Разам з тым у БДУ створаны ўсе магчымасці, каб студэнт развіваўся ўсебакова, гарманічна, станавіўся Асобай, заставаўся сапраўдным патрыётам свайго краю, сваёй сям'і, школы, ліцэя, гімназіі, каледжа, ВНУ, курса, вучэбнай групы, каб змог прымяніць назапашаныя веды на практыцы, арганічна ўвайсці ў працоўны калектыў. У Вас ёсць усе мажлівасці стаць сацыяльна актыўнымі ў грамадстве, быць прыкметнымі і ўплывовымі людзьмі, быць па-сапраўднаму творчымі стваральнікамі, каб дасканала выявіць свае глыбокія крэатыўныя здольнасці.

Выпускнік БДУ ў сваёй далейшай працы здольны зрабіць кар'еру не ў адной галіне, а ў некалькіх, у тым ліку ў навуцы, культуры, спорце, у грамадскай дзейнасці, на дзяржаўнай службе.

Пытанні «Віктарыны» ахопліваюць шматлікія бакі жыцця і дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на працягу доўгіх гадоў, яго гісторыю і сучаснасць.

БДУ – ВНУ еўрапейскага маштабу.

Вядучая вышэйшая навучальная ўстанова ў сферы нацыянальнай адукацыі Рэспублікі Беларусь. Родапачынальнік вышэйшых навучальных устаноў на Беларусі. Флагман вышэйшай школы ў незалежнай і суверэннай краіне, якая шпарка развіваецца. На Вас, сённяшнія студэнты, а заўтрашнія прафесійныя працаўнікі, ускладаецца вялікая адказнасць за стан грамадства, эканомікі, за будучыню роднай Беларусі, за лёс народа і кожнай сям'і.

Створана цудоўная і магутная дзяржава, прыгожая, дагледжаная, самабытная, у якой кожны мае магчымасці прыкласці свае намаганні для дабрабыту і росквіту.

Краіна дала студэнтам усё самае неабходнае, адкрыты шляхі для самастойнай творчасці і стваральнай працы. Вы, сябры-студэнты, робіце свой унёсак у заўтрашні дзень народа і краіны менавіта служэннем Беларусі, вучобай, актыўнай грамадскай дзейнасцю, адданасцю свайму часу, вернасцю справе і слову.

Вернасцю слаўным традыцыям універсітэцкага карпаратыўнага духу, супольніцтва прафесарска-выкладчыцкага складу і магутнага дынамічнага студэнцтва.

Vivat universitas! Vivat studiosus!

Рэктар БДУ акадэмік
С. У. АБЛАМЕЙКА

1. Карпарацыі, таварыствы прафесараў і студэнтаў у Сярэднія вякі насілі назву:
а) Universitas studentium
б) Universitas civium
в) Studia particularia
г) Studia generalia

2. Дзе і калі ўпершыню вышэйшая школа названа «ўніверсітэтам» і ў якім дакуменце?
а) Кодэкс Феадосія (Codex theodosianus) 438 г.
б) Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г.
в) Жыціе Еўфрасінні Полацкай
г) «Біблія» Францыска Скарыны

3. Універсітэтам названа вышэйшая школа, упершыню адкрытая:
а) У горадзе Канстанцінопалі ў 438 г.
б) Медыцынская школа ў г. Салерна (Італія)
в) У Парыжы Сарбона, заснаваная манахам Робер дэ Сарбонам
г) Школа ў г. Манпелье (на поўдні Францыі)

4. Факультэт свабодных мастацтваў (septem artes liberalis), які лічыўся галоўным у сярэдневяковым універсітэце, уключаў дысцыпліны:
а) Граматыку
б) Рыторыку
в) Дыялектыку
г) Арыфметыку
д) Геаметрыю
е) Астраномію
ё) Тэорыю музыкі
ж) Філасофію

5. На якой мове вялося выкладанне дысцыплін у сярэдневяковых універсітэтах Еўропы?
а) Стараславянскай
б) Вульгарна простай рускай мове
в) Італьянскай
г) Лацінскай мове

6. Цэнтральнае месца ва ўніверсітэцкім выкладанні ў XVII ст. займала дысцыпліна, якая мела сілу царкоўнага догмату:
а) Арыстоцелева філасофія
б) Вучэнне Сакрата
в) Тэорыя абарачэння нябесных свяціл Каперніка
г) Закон руху нябесных цел Іагана Кеплера

7. У далёкай старажытнасці прадказанні лёсу па лініях рукі, зорках, агню, вадзе насілі назвы:
а) Астралогія
б) Хірамантыя
в) Пірамантыя
г) Гідрамантыя

8. Як называецца маладая навука, якая мадэлюе тэхнічныя рашэнні на аснове жыццядзейнасці жывых арганізмаў?
а) Біёніка
б) Біяфізіка
в) Геаграфія
г) Геадэзія

9. Якой фразай звычайна завяршаліся рымскія камедыі?
а) «Прощайте и не забывайте о р-р-р-укоплесканиях»
б) «Finita la comedia»
в) «Ці спадабаўся Вам, рабы і патрыцыі, спектакль?»
г) «Memento mori» (лац.) – «Памятай пра смерць»

10. Каму належыць выслоўе: «Лягчэй, здаецца, рухаць самыя планеты, чым спасцігнуць іх рух»?
а) Мікалаю Каперніку
б) Галілеа Галілею
в) Джардана Бруна
г) Клаўдзію Пталамею

11. Як перакладаецца лацінская прымаўка: «Sermo datur cunctis, animi sapientia paucis»?
а) «Слова дадзена ўсім, мудрасць душы – нямногім»
б) «Спачатку было Слова, і Слова было Бог, і Слова было ў Бога»
в) «Слова на слове едзе і словам паганяе»
г) «Слова заблытвае, але слова і разблытвае»

12. Які сэнс укладваецца ў лацінскі выраз: «Dacunt volentem fata, nolentem trahunt»?
а) «Пакорлівага лёсы вядуць, таго, хто супраціўляецца, цягнуць сілком»
б) «Лёсы нашы прадвызначаны нашымі ўчынкамі»
в) «Неспавядальныя шляхі твае, Божа. І чалавечыя таксама»
г) «У кожнага свой лёс. Чалавек – гаспадар свайго лёсу»

13. Універсітэцкае выкладанне ў Сярэднія вякі сладвалася з лекцый (lectio) і дыспутаў (disputatio). Што з'яўлялася сродкам навучання, а што станавілася мэтай адукацыі?
а) Лекцыі былі сродкам навучання
б) Дыспуты з'яўляліся сродкам (формай) навучання
в) Лекцыі з'яўляліся мэтай адукацыі
г) Дыспуты станавіліся мэтай адукацыі

14. Прынцып свабоды навуковага даследавання ўпершыню абвясціў вучоны:
а) Спіноза
б) Арыстоцель
в) Францыск Скарына
г) М. В. Ламаносаў

15. Каму належаць наступныя словы: «Гісторыкі знаходзяць старажытнае гняздоўе навук у Грэцыі: адтуль яны перайшлі ў Італію і распаўсюдзіліся па ўсіх землях Еўропы... і мне верыцца, што яны ізноў калі-небудзь пакінуць сваё месцазнаходжанне ў Англіі, Францыі і Германіі і пройдуць да нас на некалькі стагоддзяў...»?
а) Францыску Скарыну
б) Пятру Першаму
в) Міхаілу Ламаносаву
г) Канцлеру ВКЛ Льву Сапегу

16. Першыя ўніверсітэты былі адкрыты ў Паўночнай Італіі ў XI–XII стст. у гарадах:
а) Балонья
б) Салерна
в) Рым
г) Неапаль
д) Падуя

17. З якой нагоды ўпершыню прагучаў «Вясельны марш» 14 кастрычніка 1843 года ў Патсдаме (Германія)?
а) На вяселлі сына сябра кампазітара
б) На спектаклі «Сон у летнюю ноч» па п'есе У. Шекспіра
в) У час вясельнага падарожжа кампазітара і яго жонкі па Германіі
г) На ўрачыстай цырымоніі вянчання дачкі бургамістра горада Патсдама

18. Студэнта ў Сярэднія вякі называлі:
а) «той, хто абпальвае бровы»
б) «дабраахвотны нявольнік»
в) «чалавек, які камень дзяўбе»
г) «той, хто грызе граніт навукі»
д) «асоба, якая ўздымаецца да вяршынь навукі, ідучы па яе камяністых сцежках»

19. Першыя славянскія ўніверсітэты ў цэнтры Еўропы ўзніклі:
а) У Празе ў 1348 г.
б) У Кракаве ў 1364 г.
в) У Севільі ў 1346 г.
г) У Вене ў 1365 г.

20. Адзначце першыя германскія ўніверсітэты, якія хутка станавіліся цэнтрамі навуковай думкі:
а) Універсітэт горада Гале ў 1694 г.
б) Гейдэльбергскі ў 1385 г.
в) Кёльнскі ўніверстітэт у 1388 г.
г) Лейпцыгскі ўніверсітэт ў 1409 г.

21. Як утвараліся сярэдневяковыя ўніверсітэты (адказаў некалькі)?
а) Універсітэты, узнікненне якіх санкцыянавана папскімі буламі
б) Універсітэты, заснаванне якіх звязана з ініцыятывай каралеўскай улады ці санкцыянавана ёю
в) Універсітэты, заснаванне якіх звязана толькі з ініцыятывай каралеўскай улады
г) Універсітэты, заснаванне якіх звязана з міграцыяй студэнтаў і выкладчыкаў з іншых універсітэтаў
д) Універсітэты як вольныя пасяленні студэнтаў і выкладчыкаў

22. Як назваў БДУ беларускі паэт Алесь Гурло ў вершы «Беларускаму ўніверсітэту», напісаным у 1922 г. да гадавіны ўтварэння?
а) «магутны дом новага жыцця»
б) «захавальнік ведаў»
в) «навукі вольны храм»
г) «агмень навукі і тварцоў»

23. Як называюць сучаснага студэнта ў моладзевым асяроддзі?
а) «паходня, якая асвятляе шлях у будучыню»
б) «посуд, які патрэбна запоўніць ведамі»
в) «хадзячая энцыклапедыя»
г) «белы каўнерык»

24. Заснавальнікам і дэканам медыцынскага факультэта БДУ ў 20-я гады XX стагоддзя стаў асабісты доктар У.І. Леніна, кіраўніка СССР, лідара Кастрычніцкай рэвалюцыі. Назавіце прозвішча дэкана медфака БДУ:
а) Прафесар М.Б. Кроль
б) Прафесар А.Ф. Фартунатаў
в) Прафесар Л.С. Мінор
г) Прафесар Б.М. Беркенгейм

25. Першадрукар, асветнік, дзеяч эпохі Адраджэння Францыск Скарына вучыўся ва ўніверсітэтах Заходняй Еўропы:
а) Балонскі ўніверсітэт
б) Універсітэт г. Падуя
в) Універсітэт Капенгагена
г) Кракаўскі (Ягелонскі) універсітэт

26. Першая вышэйшая школа на Беларусі была заснавана ў XVI стагоддзі. Ёй стала:
а) Віленская езуіцкая акадэмія
б) Полацкая езуіцкая акадэмія
в) Горы-Горыцкі земляробчы інстытут
г) Гродзенская каралеўская медыцынская акадэмія (Ecole Royale de Medicine a Grodno)

27. Адну з першых заяў з мэтай паступлення ў БДУ адправіў Васіль Ігнатавіч Чыжэўскі, які быў родам з:
а) Мястэчка Глыбокае на Віцебшчыне
б) Мядзельшчыны, в. Сваткі над Нараччу
в) Мінскай губерні, в. Паперня
г) Вёскі Дукора Пухавіцкага раёна

28. Якія чатыры мовы лічыліся дзяржаўнымі на тэрыторыі Беларусі ў 20-я гады XX стагоддзя?

ВІКТАРЫНА

а) Беларуская
б) Яўрэйская
в) Руская
г) Польская
д) Нямецкая
е) Французская
ё) Англійская

29. Якія афіцыйныя назвы ўсталяваліся за будынкамі ўніверсітэта пасля яго адкрыцця? Колькі існавала такіх будынкаў?
а) Дом №1 БДУ
б) Дом №2 БДУ
в) Дом №3 БДУ
г) Дом №4 БДУ
д) Дом №5 БДУ
е) Дом №6 БДУ
ё) Дом №7 БДУ

30. Вуліца ў Мінску, на якой размясціліся інтэрнаты, дзе жылі ўніверсітэцкія студэнты, у 1922 годзе насіла назву:
а) Універсітэцкая
б) Студэнцкая
в) Навуковая
г) Вольны гарадок

31. Будаўніцтва ўніверсітэцкага гарадка ў Мінску было распачата і завершана:
а) У 30-я гады XX ст.
б) У пасляваенны час
в) У 50-60-х гадах XX ст.
г) Не ўдалося завяршыць з-за вайны 1941–1945 гг.

32. Элегантнасць першага рэктара БДУ прафесара У.І. Пічэты падкрэслівалі дэталі яго адзення, звычкі, прадметы побыту:
а) Гальштукі, якія ён любіў насіць і часта мяняў
б) Хада з нязменным кіёчкам
в) Пенснэ замест акуляраў
г) Язда на веласіпедзе
д) Паездкі на аўто з адкрытым верхам

33. Як называў сябе першы рэктар БДУ прафесар У.І. Пічэта ў сваіх спавядальных лістах?
а) «разумовым пралетарыем»
б) «гаспадарнікам-арганізатарам»
в) «вучоным мужам»
г) «нявольнікам навукі»

34. Першы рэктар БДУ прафесар У.І. Пічэта з'яўляўся сусветна вядомым вучоным. Сфера інтарэсаў:
а) Гісторык-славіст, які займаўся вывучэннем гісторыі ўсходніх славян, у тым ліку беларускага этнасу
б) Гісторык Сярэднявечча
в) Даследаваў гісторыю ўніверсітэтаў свету
г) Вывучаў эканоміку і сацыяльны лад ў Еўропе ў мінулыя стагоддзі.

35. Дзе пахаваны, і дзе знаходзіцца надмагільны помнік першаму рэктару БДУ прафесару У.І. Пічэту?
а) У Маскве на Новадзявочых могілках
б) У Мінску на Вайсковых могілках
в) На Радзіме бацькі ў Сербіі
г) На Палтаўшчыне, дзе У.І. Пічэта нарадзіўся і закончыў гімназію

36. На базе факультэтаў БДУ ў 30-я гады XX ст. былі ўтвораны:
а) Мінскі медыцынскі інтэрнат
б) Мінскі юрыдычны інстытут
в) Беларускі інстытут народнай гаспадаркі
г) Мінскі хіміка-тэхналагічны інстытут, які ўвайшоў у склад Беларускага політэхнічнага інстытута
д) На базе Інбелкульта БДУ – Акадэмія навук БССР
е) На аснове бібліятэкі БДУ – Бібліятэка імя У.І. Леніна ў Мінску ў XX стагоддзі

37. Адзначце высокія ўрадавыя ўзнагароды, пасады апошніх гадоў жыцця рэктара БДУ А.Н. Сеўчанкі, які ўзначальваў універсітэт з 10.4.1957 па 13.4.1972г., калі ўніверсітэт дасягнуў найбольшай магутнасці ў матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні і будаўніцтве вучэбных карпусоў:
а) Заслужаны дзеяч навукі Беларусі
б) Герой Сацыялістычнай Працы
в) Дырэктар навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем БДУ
г) Нобелеўскі лаўрэат

38. Хто са свяцілаў сусветнай навукі выказваў у пісьмовай форме (звароце) жаданне пераехаць у Мінск і працаваць у БДУ?
а) А. Эйнштэйн
б) С.І. Вавілаў
в) М.І. Пірагоў
г) М.І. Лабачэўскі
д) А.І. Паляжаеў

39. У якія гады працаваў ва ўніверсітэце і выкладаў ваенную справу студэнтам БДУ «маршал Перамогі» Г.К. Жукаў?
а) У 20-30-я гады XX ст.
б) У 40-50-я гады XX ст.
в) У 60-я гады XX ст.
г) У 70-я гады XX ст.

40. «Універсітэцкі арэапаг» як памяць асветнікам зямлі беларускай ва ўніверсітэцкім гарадку ўключае помнікі:
а) Кірылу Тураўскаму
б) Францыску Скарыну
в) Еўфрасінні Полацкай
г) Сымону Будпаму
д) Васілю Цяпінскаму
е) Міколу Гусоўскаму
ё) У.І. Пічэту
ж) Я. Коласу

41. Сярэдні бал тэстаў па вызначэнні каэфіцыента інтэлекту IQ нобелеўскіх лаўрэатаў:
а) 137 балаў
б) 509 балаў
в) 105 балаў
г) 1000 балаў

42. Як перакладаецца слова «баскетбол» – адзін з улюбёных відаў спорту на філалагічным факультэце БДУ?
а) «кальцо»
б) «карзіна і мяч»
в) «бі-бяжы»
г) «гульня ў мяч»
д) «кошыкбол»

43. Назавіце прозвішча кампазітара, які напісаў «Вясельны марш»:
а) Бах
б) Бетховен
в) Моцарт
г) Мендэльсон

44. У якім месцы ракі ці возера, балота «чэрці водзяцца»?
а) «у ціхім балоце»
б) «у віры»
в) «над берагавой кручай»
г) «у чаратах»

45. Якая рэлігія зарадзілася ў Індыі?
а) Іўдаізм
б) Хрысціянства
в) Уніяцтва
г) Будызм

46. Назавіце першапрычыны заснавання ўніверсітэцкай адукацыі на беларускіх землях (адказаў можа быць некалькі):
а) Нацыянальная самабытнасць беларусаў
б) Багатая гісторыя этнасу
в) Наяўнасць культуры народа
г) Дзяржаўнасць

47. Якое значэнне мае чыгуначная станцыя Сходня пад Масквой для гісторыі БДУ?
а) Тут аднавіў працу БДУ ў кастрычніку 1943 года ў часы Вялікай Айчыннай вайны
б) Сюды пераехала жыць у гады вайны прафесура БДУ
в) Там знаходзіліся дачы творчай інтэлігенцыі з Масквы і Мінска
г) Месца збору студэнтаў і выкладчыкаў БДУ, якія хацелі працягваць вучобу ва ўніверсітэце

48. Свабодны верш (libre) носіць назву:
а) Верлібр
б) Белы верш
в) Санет
г) Ода

49. Зараджэнне студэнцкіх будаўнічых атрадаў (СБА) звязана:
а) З асваеннем цалінных зямель Казахстана
б) З неабходнасцю арганізаваць летнія студэнцкія канікулы
в) З магчымасцю для студэнтаў атрымаць матэрыяльную падтрымку для свайго бюджэту
г) З жаданнем праявіць сябе, выпрабаваць сябе працай і ўменнем жыць у калектыве
д) З імкненнем дапамагчы на будоўлях роднай Беларусі

50. Помнік студэнтам, выкладчыкам і супрацоўнікам БДУ, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, уяўляе сабой:
а) Універсітэцкі значок аб атрыманні вышэйшай адукацыі – ромб, які «рассечаны» абрысамі вінтоўкі – сімвал распачатай, але не завершанай вучобы
б) Аўтамат Калашнікава
в) Мармуровую стужку Вялікай Перамогі
г) Студэнцкі білет, пасечаны кулямі
д) Абгарэлую студэнцкую залікоўку

51. У Беларускім дзяржаўным універсітэце налічваецца шэраг факультэтаў, адукацыйных цэнтраў (абвядзіце патрэбнае):
а) 18 факультэтаў
б) 24 факультэты
в) 7 адукацыйных інстытутаў
г) 9 адукацыйных інстытутаў

52. Назавіце колькасць навукова-даследчых інстытутаў, навуковых цэнтраў:
а) 18 навукова-даследчых інстытутаў
б) 4 навукова-даследчыя інстытуты
в) 20 навуковых цэнтраў
г) 100 навуковых цэнтраў

53. У складзе БДУ працуе шэраг прадпрыемстваў:
а) 14 унітарных навукова-вытворчых прадпрыемстваў
б) 2 навукова-вытворчыя прадпрыемствы
в) 1 навукова-вытворчае прадпрыемства
г) Больш за 150 навукова-вытворчых прадпрыемстваў

54. Па якіх ступенях вышэйшай адукацыі вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў у БДУ (адказ абвядзіце)?
а) 1 і 2 ступенях (спецыяліст-магістр)
б) 1, 2, 3 ступенях (бакалаўр-спецыяліст-магістр)
в) 4 ступенях (школа-ВНУ-аспірантура-дактарантура)
г) 5 ступенях (школа-курсы-ВНУ-магістратура-аспірантура)

55. Колькі ўсяго студэнтаў усіх формаў навучання вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце?
а) 10 тыс.
б) 20 тыс.
в) 29 тыс.
г) 50 тыс.

56. У цэлага шэрага акадэмікаў НАН Беларусі лёсы звязаны з БДУ. Гэта:
а) 97 акадэмікаў
б) 200 акадэмікаў
в) 55 акадэмікаў
г) 12 акадэмікаў

57. Прафесійную падрыхтоўку ў БДУ ажыццяўляюць:
а) 2,5 тыс. выкладчыкаў
б) 5,3 тыс. выкладчыкаў
У тым ліку:
в) 400 прафесараў і звыш 1650 кандыдатаў навук
г) 14 акадэмікаў і 15 членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі
д) 800 прафесараў і 2000 кандыдатаў навук

58. Завяршыце фразу: «Спытаць – напалову...» (выберыце варыянт):
а) Здаць іспыт
б) Даведацца
в) Завяршыць навучанне
г) Угадаць

59. Суаднясіце паасобныя крылатыя выслоўі, жартаўлівыя «знакавыя» сюжэты з адпаведнымі факультэтамі:
1. «Той не матэматык, хто лічыць, што 2х2=4»
2. «Калі людзі выстраіліся ланцужком, гэта – экспедыцыя»
3. «Філалагіні – усе багіні»
4. «Факультэт Паўла Мандрыка, Іванова»
5. «Шушанскае», «Гай», «Шчомысліца»
6. «Ветру і сонцу брат»
7. «Если я мыслю, значит, существую»
8. «Трое суток не спать, трое суток шагать, ради нескольких...»
9. «С милым рай и в шалаше, если милый атташе»
10. «Закон что столб: перепрыгнуть нельзя, но обойти можно.. если хорошо учиться» (са студэнцкага фальклору)
11. «Мы разумных робім багатымі, а багатых – разумнымі»
12. «Раствори»... мне окошко»
а) Філфак
б) Мехмат
в) Геафак
г) Хімфак
д) Інстытут журналістыкі БДУ
е) Юрфак
ё) Факультэт міжнародных адносін
ж) Эканамічны факультэт
з) ФПМІ (факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі)
і) ФФСН (факультэт філасофіі і сацыяльных навук)
к) Факультэт радыёфізікі і электронікі

60. Чаму закіпеўшая шкляная колба з вадой не абпальвае, калі яе ўзяць знізу ў рукі? (Эксперымент, просьба, не паўтараць!)
а) У шкляной колбе двайное дно
б) Колба са спецыяльнага шкла
в) Кіпенне адбываецца толькі зверху
г) Падмешаны спецыяльны раствор

61. Назавіце лаўрэатаў Нобелеўскай прэміі, ураджэнцаў Беларусі:
а) Жарэс Алфёраў – віцэ-прэзідэнт Расійскай Акадэміі навук
б) Шэлдан Глешэў – член Нацыянальнай Акадэміі навук ЗША
в) Ілья Прыгожын – член Бельгійскай Акадэміі навук
г) Альберт Эйнштэйн – сусветна вядомы вучоны.

62. Хто з нашых землякоў, выхадцаў з Беларусі, стаў першым Прэзідэнтам Гавайскіх астравоў?
а) Доктар Мікола Судзілоўскі
б) Падарожнік Іван Чэрскі
в) Барыс Кіт
г) Сцяпан Аскерка

63. Хто з беларусаў стаў адным з першых вынаходнікаў шматступеньчатай ракеты, першынство якога прызнана адпаведнымі патэнтамі?
а) Казімір Семяновіч – генерал артылерыі, родам з Быхава
б) Павел Сухі – праслаўлены авіяканструктар, стваральнік вядомых самалётаў «Су»
в) Якуб Наркевіч – навуковец
г) Восіп Кавалеўскі – прафесар Казанскага і Варшаўскага ўніверсітэтаў

64. Сярод інжынераў і будаўнікоў, якія ўзводзілі арэны для першых Алімпійскіх гульняў 1896 г. у Афінах (Грэцыя), быў наш зямляк, які закончыў Акадэмію генштаба ў Парыжы. Назавіце яго імя:
а) Зігмунт Мінейка з в. Зялёны Бор на Ашмяншчыне
б) Аляксандр Булатовіч з Гродзеншчыны
в) Казімір Семяновіч з Быхава
г) Барыс Кіт з Навагрудчыны

65. Да каго звяртаўся А.С. Пушкін у вядомым выслоўі (тэкст прыводзіцца цалкам): «Здравствуй, племя младое, незнакомое! Не я увижу твой могучий поздний возраст. Когда перерастёшь моих знакомцев и старую главу их заслонишь от глаз прохожего»?
а) Да маладога сасонніку, які вырас на яго вачах
б) Да выпускнікоў ліцэя ў Царскім Сяле
в) Да сяброў-студэнтаў
г) Да дзяцей дамачадцаў

66. «А ўсё-такі яна круціцца!» Хто прамовіў дадзены выраз на кастры, верачы ў тое, што Зямля круціцца вакол сваёй восі?
а) Джардана Бруна
б) Мікалай Капернік
в) Галілеа Галілей
г) Клаўдзій Пталамей
д) Жанна д'Арк

67. Як называецца шашка, якая дасягнула краю дошкі на чужым полі?
а) Дамка
б) Каралева
в) Пешка
г) Пераможца

68. Што з'яўляецца сімвалам універсітэта на геральдычным знаку БДУ?
а) Гусінае пяро пушкінскай эпохі як сімвал адукацыі, навукі і творчасці
б) Пальмавая галінка, якой віталі ўваход Ісуса Хрыста ў Іерусалім
в) Галінка папаратніку, якая сімвалізуе сабой «папараць-кветку» – кветку шчасця, удачы, сілы, розуму і магутнасці духу
г) Галінка бярозы як сімвал беларускага краю

69. Каму належаць словы: «Не тое дорага ведаць, што зямля круглая, але вельмі важна спасцігнуць, як людзі дайшлі да гэтага»?
а) Льву Талстому з яго педагагічнай кнігі
б) А.М. Горкаму з аповесці «Мае ўніверсітэты»
в) Жаку Вержэ з «Гісторыі сярэднявяковага ўніверсітэта»
г) Карлу Ясперсу з працы «Ідэя ўніверсітэта» (ням.)
д) Джону Генры Ньюману з даследавання «Ідэя ўніверсітэта» (англ.)
е) Хасэ Артэга-і-Гасэту з кнігі «Місія ўніверсітэта».

Віктарыну падрыхтаваў дацэнт БДУ, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір НАВУМОВІЧ.

Віктарына «Папараць-кветка зацвітае для цябе ў БДУ» арганізуецца і праводзіцца ўпраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю БДУ пры ўдзеле ГА «Студэнцкі саюз БДУ» і кафедры беларускай літаратуры і культуры філалагічнага факультэта.

Віктарына праводзіцца сярод навучэнцаў БДУ дзённай формы навучання з 04.10.2010 г. па 29.10.2010 г.

Пытанні віктарыны можна знайсці:
• на сайце: *www.bsu.by* (у раздзеле Студэнцкае жыццё –Конкурсы);
• у аддзеле моладзевых праграм і праектаў УВРМ (галоўны корпус БДУ, пр. Незалежнасці, 4, к. 205, тэл. 209-52-61).

Пры ацэнцы пададзеных прац будуць улічваюцца наступныя крытэрыі:
• правільнасць адказаў;
• поўнасць раскрыцця матэрыялу ў адказе, наяўнасць дадатковай інфармацыі па пытаннях віктарыны, выкарыстаныя крыніцы;
• творчы падыход да афармлення адказаў на пытанні віктарыны.

Адказы на пытанні прымаюцца да 29.10.2010 г. у аддзеле моладзевых праграм і праектаў УВРМ (галоўны корпус БДУ, пр. Незалежнасці, 4, к. 205) у запячатаным канверце.

На канверце паказаць прозвішча, імя, імя па бацьку, факультэт, курс, групу, кантактны тэлефон. На самой працы абавязкова ўказаць прозвішча і факультэт.

Прызавы фонд віктарыны складае 1 250 000 рублёў.